ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і мастацтва

ОРГАН САЮЗА САВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 48 (907) | Субота, 29 лістапада 1952 года | Цана 50 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Першая старонка.
Перадавы. — Выяўленчае мастацтва перад дэкадай.
Любімец партыі і народа.
Навуковыя дысертацыі.
Гэта не дробязі!

Другая старонка.
З НАРАДЫ ДЗІЦЯЧЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ. Недахопы адной аповесці. Паэтычнае бачанне жыцця. Аб мастацкай праўдзе і пераканальнасці.
П. Герасімовіч. — Канфлікт у творах выяўленчага мастацтва.

Трэцяя старонка.
Л. Абецэдарскі і А. Сідарэнка. — Няўдалая кніга пра Георгія Скарыну.
Г. Шчарбатаў. — Высокародныя рысы савецкага чалавека.
С. Майхровіч. — Міхась Машара.

Чацвертая старонка.
Дзяржаўны народны хор і яго рэпертуар.
П. Малчанаў. — Чаму не працуе мастацкі савет тэатра імя Я. Купалы?
С. Палеес. — Мастак жыццёвай праўды.
А. Бястужаў. — «Машанька».

Выяўленчае мастацтва перад дэкадай

XIX з'езд Комуністычнай партыі паставіў перад савецкім мастацтвам задачу глыбокага і ўсебаковага адлюстравання яркай і шматграннай дзейнасці савецкага чалавека, яго барацьбы за пабудову комунізма.

Рыхтуючыся да дэкады беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве, жывапісцы, скульптары і графікі Савецкай Беларусі працуюць над стварэннем вобразаў геніяў чалавецтва — Леніна і Сталіна, над тэмамі соцыялістычнай працы савецкіх людзей. Велічны манумент І. В. Сталіна, устаноўлены на Цэнтральнай плошчы Мінска, створан скульптарамі З. Азгурам, А. Бембелем, А. Глебавым і С. Селіханавым.

З. Азгур вылепіў скульптурныя партрэты Г. М. Маленкова і К. Е. Варашылава.

С. Раманаў у жанры станкавай графікі напісаў партызанскую сюіту, прысвечаную героям Вялікай Айчыннай вайны Заслонаву, Бумажкову, Гуляеву, Кунько і Сільніцкаму.

С. Селіханаў закончыў скульптуру «М. Салтыкоў-Шчэдрын».

Майстры народнай творчасці Гродзеншчыны пры непасрэдным удзеле прафесійных мастакоў заканчваюць вялікі габелен на тэму «Сталін — наш сцяг». Над габеленам, прысвечаным вялікаму Сталіну, працуюць мастакі і вышывальшчыцы ў Баранавічах.

У абласных цэнтрах рэспублікі адкрыліся выстаўкі прафесійнага і самадзейнага выяўленчага мастацтва.

Аднак, за асобнымі выключэннямі, становішча з работамі прафесійных мастакоў Мінска і абласцей, якія мяркуецца паказаць на дэкадзе, выклікае сур'ёзную трывогу.

У свой час праўленне Саюза мастакоў распрацавала арыентыровачны тэматычны план работ мастакоў на гэты год, дзе прадугледжаны важнейшыя тэмы, над якімі павінны былі працаваць жывапісцы, скульптары і графікі. Асобныя мастакі атрымалі творчыя камандзіроўкі. Аднак большасць тэм плана засталася нерэалізаванай.

Не напісаны карціны і не створаны скульптуры, прысвечаныя вялікім будоўлям комунізма, няма буйных работ у жанравым жывапісу.

У тэматычным плане багата ўвагі было аддадзена людзям буйнейшых заводаў рэспублікі, новаму ў калгасным жыцці і будаўніцтве, гісторыка-рэвалюцыйнай тэме. Выканана мастакамі з гэтага плана вельмі мала. Не распрацавалі сваіх тэм нават тыя мастакі, якія атрымалі творчыя камандзіроўкі. Так, П. Дурчын не напісаў пейзажаў новага Мінска, а стварыў слабыя па майстэрству замалёўкі, якія не былі ўхвалены ў Саюзе мастакоў. Абыякава паставіўся да творчай камандзіроўкі і А. Забораў, які прывёз нецікавыя пейзажы замест карціны аб Днепра-Бугскім канале.

Апрача твораў С. Раманава, станоўча ацэненых мастацкім саветам Камітэта па справах мастацтва пры Савеце Міністраў БССР, нічога значнага пакуль што няма і ў станкавай графіцы.

Саюз савецкіх мастакоў і Дзяржаўнае выдавецтва БССР абыякава паставіліся да стварэння мастацкіх плакатаў, якія з'яўляюцца дзейсным сродкам палітычнай агітацыі і павінны несці ў шырокія масы ідэі комуністычнай партыі. Работу над палітычным плакатам асноўныя кадры мастакоў чамусьці лічаць другараднай, а спецыяльныя майстры плаката не выхоўваюцца. У выніку — плакатаў няма, і, апрача аднаго мастака, ніхто над імі пакуль што сур'ёзна не працуе.

Не адчуваецца значнага росту і ў жанры палітычнай сатыры. Слаба выкарыстоўваецца вопыт мастакоў-сатырыкаў Кукрыніксаў, Б. Ефімава і другіх па напісанню яркіх сатырычных партрэтаў, тэматычных цыклаў сатырычных малюнкаў на міжнародныя тэмы.

Мастакі недаравальна мала працуюць над жанравымі карцінамі.

Да гэтага часу беларускія жывапісцы яшчэ не здалі мастацкаму савету Камітэта па справах мастацтва пры Савеце Міністраў БССР і мастацкаму савету дэкады ніводнага палатна. Такім чынам застаецца зусім мала часу для грамадскай ацэнкі твораў, прызначаных для дэкадных выставак.

У Саюзе мастакоў шырокая і прынцыповая крытыка не разгорнута.

За апошні час не праяўляе ніякіх азнак жыцця секцыя тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва (кіраўнік П. Масленнікаў), якая павінна абмяркоўваць афармленне дэкадных спектакляў. Не працуе секцыя скульптараў (кіраўнік А. Глебаў). Рэдка збіраюцца секцыі жывапісу (старшыня В. Цвірка) і графікаў (старшыня В. Ждан).

Няма ў Саюзе мастакоў абмеркавання надзённых праблем развіцця беларускага соцыялістычнага мастацтва. На секцыі не запрашаюцца прадстаўнікі сумежных галін мастацтва. Сустрэчы з гледачамі адбываюцца толькі ў час выставак і то выключна ў параднай форме.

Усё гэта знізіла значэнне крытыкі ў Саюзе да таго, што асобныя мастакі не жадаюць знаёміць са сваімі работамі нават і праўленне Саюза. А кіраўнікі праўлення не змагаюцца супраць такіх адсталых настрояў.

Работнікі праўлення рэдка выязджаюць у майстэрні мастакоў для азнаямлення з работай над новымі творамі. Абмеркаванне новых работ чамусьці ў асноўным перададзена мастацкаму савету Камітэта па справах мастацтва. Аднак савет займаецца толькі справамі мастакоў, якія заключылі з Камітэтам умову і атрымалі ад яго авансы.

Сустрэчы з членамі савета не з'яўляюцца ў творчых адносінах поўнацэннымі, бо там часта вырашаюцца пераважна арганізацыйныя пытанні. Мастаку ў радзе выпадкаў даюцца асобныя прафесійныя, часта дробныя заўвагі замест глыбокага ідэйна-творчага аналізу яго работы.

Адкрытыя нядаўна абласныя выстаўкі паказалі невысокі мастацкі ўзровень работ многіх прафесійных мастакоў. Недахопы гэтых выставак тлумачацца не толькі слабасцю майстэрства іх удзельнікаў, але і фармальнымі адносінамі да мастакоў абласных цэнтраў з боку рэспубліканскага праўлення Саюза. Надзвычай рэдкія і кароткатэрміновыя «гастролі» прадстаўнікоў праўлення ў асобныя абласныя гарады не могуць ні ў якой ступені задаволіць патрэбу прафесійных і самадзейных мастакоў раёнаў і абласцей у сталай і кваліфікаванай творчай дапамозе.

Зараз неабходна плённа выкарыстаць літаральна кожны дзень. Творчая дапамога павінна быць цяпер накіравана на тое, каб павысіць майстэрства карцін і скульптур, якія заканчваюцца мастакамі.

Прынцыповая грамадская крытыка і самакрытыка, шырокае абмеркаванне работ мастакоў — важнейшы абавязак праўлення Саюза савецкіх мастакоў Беларусі і Камітэта па справах мастацтва пры Савеце Міністраў БССР.

Пленум Савецкага камітэта абароны міру

26 лістапада ў Маскве адбыўся пленум Савецкага камітэта абароны міру. Пленум абмеркаваў пытанне аб падрыхтоўцы да прадстаячага Кангрэса народаў у абарону міру.

Пленум Савецкага камітэта абароны міру прыняў рашэнне склікаць 2 снежня г. г. у Маскве Чацвёртую Усесаюзную канферэнцыю прыхільнікаў міру.

Будаўніцтва кінатэатраў

Кожны год у строй уступаюць новыя кінатэатры. У гэтым годзе ў рэспубліцы будуецца 17 кінатэатраў і летніх кінапляцовак. Будынкі ўзводзяцца па тыпавых праектах, у якіх прадугледжана ўтульная глядзельная зала, фае, буфет. На будаўніцтва кінатэатраў у рэспубліцы будзе выдаткавана 4,5 мільёна рублёў.

Да канца года будуць уведзены ў строй кінатэатры ў Маладзечна, Давыд-Гарадку, Грэску, Глыбокім і Берастовіцах. Распачата будаўніцтва кінатэатраў у Оршы, Быхаве, Жлобіне і Бялынічах. Два кінатэатры будуюцца ў Мінску: на Ціхай вуліцы — на 250 месц і на праспекце імя Сталіна — на 500 месц.

Любімец партыі і народа

Да 18-й гадавіны з дня смерці С. М. Кірава.

Восемнаццаць год таму назад загінуў на баявым пасту ад рукі агіднага найміта крывавага імперыялізма любімец партыі і народа, палымяны трыбун рэвалюцыі Сяргей Міронавіч Кіраў. Але час не ў сілах аслабіць пачуццё болю народнага за свайго выдатнага сына, засланіць яркі вобраз нястомнага змагара за шчасце працоўных.

Жыццё і дзейнасць Сяргея Міронавіча Кірава з'яўляюцца для мільёнаў савецкіх грамадзян і прагрэсіўных людзей усяго свету жывым прыкладам, як трэба змагацца за свабоду, супраць эксплаататараў, грабежнікаў, падпальшчыкаў вайны.

Сваёй шматгадовай кіпучай працай у час першай рускай рэвалюцыі, падрыхтоўкі і правядзення соцыялістычнай рэвалюцыі, у гады грамадзянскай вайны і будаўніцтва соцыялізма Кіраў, знаходзячыся ўвесь час на адказных пастах, даў нам узор мужнасці, бясстрашша, беззаветнай адданасці справе партыі Леніна—Сталіна.

На якой-бы рабоце Кіраў ні знаходзіўся: кіраваў томскімі рабочымі ў 1904—1905 гадах або праводзіў рэвалюцыйную работу на Каўказе, узначальваў ваенныя сілы бальшавікоў у Астрахані ў перыяд грамадзянскай вайны або арганізоўваў рабочы клас Азербайджана на ўздым нафтавай прамысловасці — усюды і заўсёды таварыш Кіраў высока трымаў сцяг ленінізма.

Апошнія восем год жыцця Кіраў узначальваў ленінградскую партыйную арганізацыю. Пад яго кіраўніцтвам ленінградскія комуністы бязлітасна разграмілі трацкісцка-бухарынска-зіноўеўскую агентуру капітулянтаў і ператварылі горад Леніна ў буйнейшы індустрыяльны цэнтр нашай Радзімы.

Будучы кіпучым працаўніком, дзеячом ленінска-сталінскага тыпу, Сяргей Міронавіч з'яўляўся адначасова выдатным тэарэтыкам партыі.

Палымяныя прамовы Кірава — гэта прыклад глыбокага марксісцка-ленінскага пранікнення ў з'явы, падзеі.

Выступаючы на сходзе ленінградскага партыйнага актыву 17 студзеня 1933 года, Кіраў гаварыў: «Таварышы, многа стагоддзяў таму назад вялікі матэматык марыў знайсці пункт апоры для таго, каб, апіраючыся на яго, павярнуць зямны шар. Прайшлі стагоддзі, і гэтая апора не толькі знойдзена, яна створана нашымі рукамі. Не пройдзе многа год, як мы з вамі, апіраючыся на заваёвы соцыялізма ў нашай савецкай краіне, абодва зямныя паўшар'і павернем на шлях комунізма».

Кіраў выказваў непахісную ўпэўненасць, што сілы старога, струхлелага свету капіталізма будуць змецены з твару зямлі. «Усё, што блытаецца пад нагамі, што хістаецца і сумняваецца, павінна быць пакінута ў гістарычным бяздонні, а нам з вамі дарога толькі ўперад і толькі да перамогі».

Маяком шчасця, светлай надзеяй усяго перадавога чалавецтва называў Кіраў нашу Савецкую Радзіму. «Увесь зямны шар раскалоўся на два гіганцкія паўшар'і: на адным ноч, цемра і запусценне і мёртвае слова — смерць, на другім — жыццё, праца і творчасць і пераможнае слова — уперад, да новага шчасця».

Ацэньваючы грабежніцкія імперыялістычныя войны, як прадсмяротныя сударгі гінучага капіталістычнага свету, Кіраў указваў, што гэтыя войны не выратуюць капіталізм, а толькі хутчэй спіхнуць яго ў бяздонне, паскораць яго пагібель. «І якія-б саюзы паміж сабою ні заключалі капіталісты, якія-б махінацыі капіталісты ўсіх краін ні рабілі супраць вялікага рабоча-сялянскага Савецкага Саюза, зараз няма ніякага сумнення, што ні той эмблеме, якая паказвае льва, ні той эмблеме, якая паказвае арла з адной або двума галовамі, будучыня не належыць. **Будучыня належыць той эмблеме працы, якая намалявана на нашых сцягах, з якой мы выйшлі ў Кастрычніцкую рэвалюцыю, будучыня належыць Сярпу і Молату».**

Кіраў — нястомны барацьбіт за справу міру, за дружбу паміж народамі. «Палітыка міру, — гаварыў Сяргей Міронавіч, — узняла на небывалую вышыню аўтарытэт Савецкага Саюза ў вачах працоўных усіх краін. Мы цалкам і цвёрда за мір, мы нікога не хочам трывожыць, ні на кага не збіраемся нападаць, ні ад каго не збіраемся адбіраць якіх-небудзь зямель, але мы ніколі не дазволім пасягнуць на нашу савецкую зямлю».

У сваіх выступленнях таварыш Кіраў неаднаразова падкрэсліваў велізарнейшую ролю ў будаўніцтве комунізма рэвалюцыйнай тэорыі, соцыялістычнай ідэалогіі, літаратуры і мастацтва. Як свежа гучаць словы таварыша Кірава аб тым, што «ніколі, ні ў адну эпоху гэтая тэорыя не адыгрывала такога велізарнага значэння, якое яна адыгрывае зараз».

Сяргей Міронавіч указваў, што для нашай краіны выключна важнае значэнне маюць не толькі перамогі на фабрыках і заводах, але і перамогі на фронце літаратуры і мастацтва. Надаючы велізарнейшае значэнне мастацкай літаратуры ў культурным выхаванні, Кіраў раіў адказным работнікам больш чытаць мастацкіх твораў. «І для белетрыстыкі трэба знайсці час, інакш мазгі засохнуць».

Прамовы, выступленні Кірава паказваюць нам, як умела ён выкарыстоўваў мастацкую літаратуру, вялікую сілу яе вобразаў.

Пры сустрэчах з работнікамі літаратуры і мастацтва Кіраў вучыў іх няспынна павышаць патрабавальнасць да сябе, разгортваць прынцыповую крытыку і самакрытыку, удасканальваць прафесійнае майстэрства.

Таварыш Кіраў заклікаў усіх комуністаў, усіх рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыю цясней згуртавацца вакол партыі, вакол геніяльнага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна. **«Магутная воля, велізарны арганізатарскі талент гэтага чалавека,** — гаварыў Сяргей Міронавіч аб Сталіне, — **забяспечваюць партыі своечасовае правядзенне вялікіх гістарычных паваротаў, звязаных з пабеданосным будаўніцтвам соцыялізма».**

Цяпер, калі вялікая армія комуністаў, мільённыя масы рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі, узброеныя гістарычнымі рашэннямі XIX з'езда партыі Леніна—Сталіна, заняты самаадданай стваральнай працай па будаўніцтву комунізма, вобраз незабыўнага трыбуна рэвалюцыі, любімца партыі і савецкага народа Сяргея Міронавіча Кірава, як жывы, кліча нас уперад, на пераадоленне ўсіх цяжкасцей, на ажыццяўленне гістарычных рашэнняў. Прарочкі і цудоўна гучаць палымяныя кіраўскія словы: «Няхай заўтра гісторыя паставіць перад намі яшчэ больш складаныя і цяжкія задачы, — нам яны не страшныя, таму што заўтра, узбагачаныя велізарным вопытам, мы будзем яшчэ больш цвёрда, яшчэ больш вытрымана, яшчэ больш арганізавана праводзіць указанні нашай партыі, нашага правадыра таварыша Сталіна».

Навуковыя дысертацыі

На шматлікіх кафедрах Мінскага медыцынскага інстытута праводзіцца значная навукова-даследчая работа. За пасляваенны перыяд у інстытуце абаронена звыш 60 дысертацый, з іх 9 доктарскіх. Званне доктара медыцынскіх навук было прысвоена прафесарам Т. Бірыч, Ф. Яхімовічу, З. Магілёўчыку, Р. Мінінай, Г. Дазорцавай і другім. Паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі П. Бяляеў, І. Старавойтаў, К. Паўлюкоў, П. Сяржанін, П. Кніга, Е. Шавялько і другія.

У пятай сталінскай пяцігодцы ў інстытуце запланавана падрыхтоўка звыш 100 дысертацый, 20 з іх — доктарскіх. Частка работ ужо выканана. У плане навукова-даследчай работы значнае месца адведзена выкананню рашэнняў XIX з'езда партыі аб ахове здароўя працоўных.

Вялікую цікавасць выклікае дысертацыя асістэнта В. Прохарава, які распрацаваў спосаб барацьбы з шокам шляхам узнаўлення сігналізацыі з перыферыі ў цэнтральную нервовую сістэму. Дзесяткі людзей выратаваў ад немінучай смерці асістэнт Прохараў. Яго спосаб у акушорскай клініцы прымяніў праф. Персіянінаў; праф. В. Трусевіч выкарыстаў спосаб В. Прохарава для лячэння тэрапеўтычных хворых.

Аспірантка Е. Шавялько пад кіраўніцтвам прафесара Ф. Яхімовіча з поспехам выканала работу па аднаўленню незаслужана адвергнутага ў мінулым падскурнога пералівання крыві. У медыцыне ўкаранілася думка, што кроў, якая ўлілася пад скуру, назад у крываносныя сасуды не паступае і падвяргаецца разлажэнню. Неабгрунтаваныя і няўдалыя эксперыменты зарубежнага даследчыка Цімсена былі прычынай такога пункту погляду. Праф. Ф. Яхімовіч і аспірантка Е. Шавялько даказалі, што ўведзеная ў вялікіх колькасцях пад скуру кроў паступае ў крываноснае русла і выратоўвае ад пагібелі абяскроўленых жывёл. Прафесар І. Мішэнін паспяхова прымяніў гэты спосаб больш чым на 300 хворых. Такім чынам урачы атрымалі яшчэ адзін спосаб лячэння.

Сярод маладых навуковых работнікаў асобае месца займаюць аспіранты. Ім зараз аддаецца многа ўвагі. Аспіранты Н. Бань, К. Чайка, Г. Заблоцкая прыйшлі ў навуковыя лабараторыі з практычнай работы і паспяхова выконваюць даследчую работу, прысвечаную далейшаму развіццю ідэй Паўлава.

Лепшыя навуковыя работы супрацоўнікаў інстытута публікуюцца ў форме манаграфій, артыкулаў, аўтарэфератаў і тэзісаў. У 1951—52 г. г. на канферэнцыях было абмеркавана звыш 150 навуковых работ супрацоўнікаў і студэнтаў інстытута.

М. МЕРАЖЫНСКІ,
доктар медыцынскіх навук.

ГЭТА НЕ ДРОБЯЗІ!

ГРАДАБУДАЎНІЦТВА — высокае мастацтва. У ім спалучаецца і талент зодчага і майстэрства рабочага—каменшчыка, тынкоўшчыка, маляра, слесара. Праца гэтых людзей вельмі адказная. Створаныя імі будынкі жывуць стагоддзі. Таму архітэктурнае афармленне, стыль, аддзелка кожнага дома павінны быць глыбока прадуманы з тым, каб архітэктурныя ансамблі нашых гарадоў адлюстроўвалі веліч і прыгажосць сталінскай эпохі.

За пасляваенны час будаўнікі нашай рэспублікі навучыліся ўзводзіць цудоўныя будынкі, дабіліся значных поспехаў у галіне механізацыі работ. Накопліваючы вопыт, яны з дня ў дзень усё лепш спраўляюцца з ускладзенымі на іх задачамі.

Каб пераканацца ў гэтым, варта прайсціся па шырокаму праспекту імя Сталіна ў Мінску. Архітэктурны ансамбль гэтай часткі горада радуе вока, стварае прыемны настрой. Гэта думка не толькі мінчан, але і шматлікіх гасцей, што наведваюць сталіцу нашай рэспублікі. Цэнтральную магістраль упрыгожваюць з густам афармленыя шматпавярховыя дамы, цудоўны будынак універмага, прасторныя плошчы, скверы. Жыхары многіх дамоў сардэчным, удзячным словам успамінаюць будаўнікоў за іх шчырую працу.

Багатая тэхніка, наяўнасць кваліфікаваных кадраў, неабходных матэрыялаў—усё гэта дазваляе будаваць не толькі хутка, але і высокаякасна. На жаль, у пагоні за тэмпамі, будаўнікі часта не звяртаюць увагі на якасны бок работы, забываюць аб тым, што малейшыя адступленні ад праекта і нават невялічкія недаробкі прыводзяць іншы раз да вельмі непрыемных вынікаў.

Наваселле — вялікая падзея. З радасцю ўсяляліся сёлета жыхары ў новы дом на вуліцы Горкага, які будаваў трэст № 1 «Галоўмінскбуда» (прараб тав. Каган). Але варта было прайсці першаму дажджу, як настрой людзей сапсаваўся: з балконаў у кватэры пацякла вада.

— Вось табе і сюрпрыз, — абураліся жыхары.

— Нічога, нічога, — супакойвалі іх будаўнікі.—Невялічкая няўвязка атрымалася, выправім. Гэта-ж дробязь, уласна кажучы.

Між тым, за «дробяззю» хавалася значнае адступленне ад праекта. Частка балконаў была зроблена вышэй падлогі ў кватэрах, а частка не была абабіта дахавым жалезам. Акрамя ўсяго, цокаль будынка не быў пакрыты ахоўнай абліцоўкай.

Прыкра, што аналагічных фактаў нямала. Часта ў новых дамах, літаральна праз некалькі тыдняў пасля здачы іх у эксплаатацыю, пачынае працякаць дах, абвальваецца тынкоўка, сырэюць сцены. Бываюць і іншыя нечаканасці. Раптам перастаюць зачыняцца дзверы, рассыхаецца падлога. З такімі непрыемнасцямі сустрэліся, напрыклад, жыхары некаторых дамоў гарадскога Савета па вуліцы Карла Маркса і па праспекту імя Сталіна. Асабліва неахайна пабудаваны дом трактарнага завода на Круглай плошчы. На працягу некалькіх год тут не ўстанаўліваліся агарожы на балконах, а сам будынак стаяў неатынкаваны.

Яшчэ горшае становішча з якасцю будаўніцтва ў іншых гарадах рэспублікі. У чэрвені будаўніча-мантажнае ўпраўленне № 9 «Галоўпрамбуда» ў горадзе Барысаве (в. а. галоўнага інжынера тав. Шаўчанка) закончыла будаўніцтва жылога дома па вуліцы III Інтэрнацыянала. З-за буйных дэфектаў дзяржаўная камісія тройчы адмаўлялася прыняць гэты будынак. Дах у многіх месцах працякаў, падлога рассохлася. Толькі пераробка даху каштавала 8 тысяч рублёў. Амаль паўгода дом не засяляўся.

Такіх прыкладаў можна прывесці многа. Але справа не ў пераліку фактаў. Закранаючы гэтае пытанне, варта ўспомніць адносіны некаторых будаўнікоў да даручанай ім справы. Хай хто-небудзь паспрабуе, напрыклад, указаць упраўляючаму трэста № 2 «Галоўпрамбуда» тав. Паперна на тыя ці іншыя недахопы. Ён са здзіўленнем павядзе плячыма і пачне вас запэўніваць, што ўсё гэта «дробязі».

Не, таварышы будаўнікі. Нельга мірыцца з тым, калі дыміць пліта і на столі паяўляюцца мокрыя плямы. Усё, што пагаршае быт савецкіх людзей — не «дробязь». Неабходна аб'явіць суровую барацьбу ўсялякім «недаробкам» і «пераробкам». Калі ў заселены дом пачынаюць прыходзіць рабочыя і нешта выпраўляць, гэта ўжо не «дробязь», а брак.

Вельмі важна, каб усе будаўнікі, без выключэння, зразумелі, якая вялікая адказнасць ускладзена на іх, і настойліва змагаліся за часць сваёй маркі. Вялікую ролю тут павінен адыграць станоўчы прыклад у рабоце. Сярод будаўнікоў ёсць нямала сапраўдных майстроў сваёй справы. На ўсю рэспубліку вядомы імёны знатных каменшчыкаў сталіцы Дзяніса Булахава, Анфіла Філіпава, тынкоўшчыкаў Трыфана Громава, Соф'і Марозавай і дзесяткаў другіх стаханаўцаў. На жаль, іх вопыт работы не стаў пакуль што здабыткам шырокіх мас будаўнікоў. Яшчэ і сёння побач з лепшымі стаханаўцамі працуюць рабочыя, якія сістэматычна дапускаюць брак.

Ці хваляе гэта кіраўнікоў будоўляў—начальнікаў участкаў, прарабаў? На жаль, не ўсіх і не заўсёды. Больш таго, часта з-за іх паспешлівасці і няўважлівасці атрымліваюцца розныя недарэчнасці. Многа розных дэфектаў на тых будоўлях, дзе начальнікам участка тав. Эйдэльман (трэст № 2 «Галоўпрамбуда»). То пачынае працякаць дах, то выяўляецца, што забыліся пакінуць месца для пракладкі труб і прыходзіцца прабіваць сцены і г. д.

Савецкія людзі хочуць, каб дамы, у якіх яны жывуць, былі аформлены прыгожа, з густам. Гэта зусім законнае патрабаванне.

Некалькі месяцаў назад у сталіцы нашай Радзімы — Маскве была арганізавана выстаўка будаўнічай тэхнікі і будаўнічых матэрыялаў. Там можна было ўбачыць многа цікавага і павучальнага. Адной з навін з'яўляецца тое, што будаўнічая пляцоўка па сутнасці ператвараецца ў своеасаблівы зборачны цэх, дзе будынак мантыруецца з закончаных дэталей і канструкцый заводскага вырабу. Безумоўна, такая індустрыялізацыя работ не толькі паскарае будаўніцтва, але і прыводзіць да значнага павышэння яго якасці.

На выстаўцы дэманстраваліся разнастайныя новыя будаўнічыя матэрыялы—сілікатная цэгла, светлая кераміка, жалезабетонныя пліты, абліцаваныя дывановай мазаікай, і многае іншае.

Такія матэрыялы можна выраблят[illegible]
прадпрыемствах нашай рэспублікі.
Міністэрства прамысловасці буд[illegible]
матэрыялаў БССР вельмі марудна [illegible]
за гэтую справу. Трэба сказаць, [illegible]
вукова-даследчы інстытут гэтага [illegible]
стэрства слаба змагаецца за ўк[illegible]
вытворчасць новых відаў бу[illegible]
тэрыялаў.

Расце матэрыяльны і [illegible]
вень працоўных [illegible]
шаюцца іх па[illegible]
здавалася [illegible]
нас задач [illegible]
тацьбу [illegible]
Наш[illegible]
Ўрад [illegible]

З нарады дзіцячых пісьменнікаў Беларусі

На творчай нарадзе па дзіцячай літаратуры, якая нядаўна адбылася ў Мінску з удзелам маскоўскіх, ленінградскіх, украінскіх і латвійскіх пісьменнікаў, былі абмеркаваны творы, напісаныя беларускімі пісьменнікамі для дзяцей. Абмеркаванне прайшло на высокім прафесійным узроўні і, бясспрэчна, прынесла вялікую карысць.

Якія-ж вынікі можна папярэдне падвесці, калі гаварыць аб рабоце гэтай нарады?

З найбольшай яскравасцю выявілася на нарадзе, што ў нас вялікі атрад пісьменнікаў піша для дзяцей, што за апошнія гады напісана нямала добрых твораў для нашага падрастаючага пакалення, што значная частка гэтых твораў перакладзена на рускую мову і стала здабыткам саюзнага чытача.

У той-жа час выявілася, што ў развіцці беларускай дзіцячай літаратуры ёсць вельмі многа сур'ёзных недахопаў. Аб іх гаварылася на нарадзе з усёй прынцыповасцю, без якіх-бы там ні было скідак, без усялякай боязні пакрыўдзіць аўтара ці рэдактара. Адзначалася перш за ўсё тое, што ў нас часамі яшчэ вельмі нізкая патрабавальнасць да аўтараў, якія пішуць для дзяцей, далёка не здавальняючая якасць рэдагавання. Некаторыя аўтары паспяшылі выпусціць у свет свае кнігі. Не папрацавалі як след над імі і рэдактары. Секцыя дзіцячай літаратуры не паклапацілася аб тым, каб гэтыя творы былі своечасова абмеркаваны і каб абмеркаванне твораў было сапраўды прынцыповым.

Да ліку такіх твораў былі аднесены перш за ўсё аповесць М. Гамолкі «Добры дзень, школа!», паэма «Чандра» П. Валкадаева і аповесць «Саломка» А. Авечкіна.

Большасць выступаючых гаварыла, што аповесць М. Гамолкі напісана вельмі паспешліва і непрадумана, без глыбокага ведання матэрыялу. П. Валкадаеву было ўказана на тое, што яго паэма вельмі нізкая па сваіх мастацкіх якасцях: яна распадаецца кампазіцыйна, у многіх месцах нагадвае проста сяк-так зарыфмаваныя радкі, а не паэтычны твор. Аўтар узяўся пісаць аб тым, чаго сам дасканала не ведае.

Абедзве гэтыя кнігі, як правільна зазначалася на нарадзе, не павінны былі ў такім выглядзе выйсці ў свет Значнай дапрацоўкі патрабавала таксама і кніга А. Авечкіна.

І тут нельга не звярнуць увагу на адну акалічнасць. Калі прадстаўнікі брацкіх літаратур М. Прыляжаева, М. Белахава, Н. Носаў, Б. Чалы і іншыя гаварылі аб недахопах гэтых кніг у поўны голас, падрабязна і пераканаўча, з адчуваннем адказнасці за лёс дзіцячай літаратуры, то з боку нашых пісьменнікаў усё-ж часам адчувалася непатрэбная асцярожнасць, нейкая аглядка на сяброўскія адносіны. Не прызвычаіліся яшчэ ў нас да шчырых і адкрытых творчых размоў. І на сходах секцый мы калі-ні-калі стараемся абыйсці вострыя вуглы, і ў рэцэнзіях, і ў крытычных артыкулах. Таму і з'явілася ў газеце «Літаратура і мастацтва» па сутнасці станоўчая рэцэнзія Ул. Шахаўца на слабую аповесць М. Гамолкі, таму і выходзіць гэтая аповесць у Дзяржаўным педагагічным выдавецтве БССР асобным выданнем ды яшчэ з грыфам «Школьная бібліятэка».

Ясна, што ўсё гэта толькі шкодзіць развіццю беларускай дзіцячай літаратуры.

Правільна было падкрэслена на нарадзе, што ў нашых творах для дзяцей усё яшчэ ледзь толькі закранута індустрыяльная тэма, што ў нас вельмі мала добрых твораў аб школе, аб піонерах, што амаль нічога не напісана для дашкольнікаў. Слушна гаварылася аб перакладах твораў беларускіх пісьменнікаў на рускую мову. Прыводзіліся шматлікія прыклады перакладчыцкага браку і адзначалася, што не толькі перакладчыкі, але і многія аўтары твораў слаба клапоцяцца аб якасці перакладаў.

Паэма А. Бялевіча «Ідзі, мой сын» была прадстаўлена на абмеркаванне ў перакладзе А. Пракоф'ева. Калі пачалі чытаць гэты пераклад, то аказалася, што ён да таго далёкі ад арыгінала, што твор нельга было абмяркоўваць. Аднак-жа да гэтага аўтар паэмы, відаць, згоджан быў з такім перакладам.

Варта ўказаць і на некаторыя арганізацыйныя непаладкі ў рабоце нарады. Не зусім правільным быў выбар твораў для абмеркавання: мэтазгодна было ўключыць у парадак дня творы П. Панчанкі, М. Аўрамчыка, І. Грамовіча, М. Паслядовіча. Была прызначана да абмеркавання паэма М. Калачынскага, але аўтар не з'явіўся на паседжанне. Некаторыя дакладчыкі па творах не былі як след падрыхтаванымі. Частка паседжанняў пачыналася са спазненнем.

Недахопы адной аповесці

З выступлення М. ПРЫЛЯЖАЕВАЙ

Аб аповесці М. Гамолкі я буду гаварыць з той шчырасцю, з якой гаворыць чалавек аб справе, блізкай яму, роднай, добра знаёмай, таму што я сама напісала шэсць школьных аповесцей. Я вельмі рэўніва адношуся да гэтай тэмы. Калі цэлы рад пісьменнікаў пачыналі гэтую тэму на пустым месцы, то для пісьменнікаў, якія ідуць услед, адкрываецца дарога больш лёгкая, ім няма чаго паўтараць памылкі і недакладнасці ранейшых школьных аповесцей. Трэба, каб новы твор быў лепшым за ранейшы, па крайняй меры не горшым.

Мне здаецца, што аповесць М. Гамолкі нічога новага, нічога свежага не дадае да таго, што ўжо было створана.

Трэба сказаць, што крытыка ў нас наогул слабая, а крытыка па дзіцячай літаратуры недаравальна слабая. І тыя крытычныя артыкулы, рэцэнзіі, выступленні, якія былі ў прыватнасці па гэтай тэме, унеслі нямала блытаніны.

Я, напрыклад, лічу, што сама назва «школьная аповесць» была недакладнай. Гэты тэрмін няправільна арыентаваў пісьменнікаў. Пісаць аб школе ізалявана нельга. Няправільна глядзець на справу так: вось школа, вось клас, вось настаўнік, а што за сценамі школы — гэта мяне не датычыцца. Існуе меркаванне, што школьная аповесць абавязкова павінна паказваць урок. Што, моў, за «школьная аповесць», калі там няма ўрокаў!

М. Гамолка вельмі знешне ўспрыняў гэтае ўказанне крытыкі. І вось ён паказаў урок. Паказаў так, як гэты ўрок павінен быць адлюстраваны ў методыцы выкладання, але не ў мастацкім творы. Узаходзіць настаўнік, чытае аповесць, усе дзеці ўсхваляваны. Гэта правільна па методыцы. Але калі чытаеш гэта ў мастацкім творы, то здаецца, што ты прысутнічаеш на сумным, нецікавым уроку.

Галоўны герой аповесці Косця паказваецца, па-мойму, вельмі дыдактычна. Многія яго разважанні правільныя, але нецікавыя таму, што ў іх няма нічога ад хлопчыка, ад жывога чалавека. І Косця пры ўсёй сваёй правільнасці пачынае выклікаць унутраны пратэст. Хлопчык, які заўсёды ўсіх павучае, ніколі не будзе любімым. Ён здаецца карыкатурна прыкладным. Ці можа наш станоўчы герой быць прыкладам на хадулях?

Аб настаўніцы. Педагагічная аўдыторыя — гэта разумная, чулая аўдыторыя. Я не раз сустракалася з педагогамі, ведаю, як цудоўна разумеюць педагогі кнігу. Але, на жаль, і сярод настаўнікаў вылучаюцца іншы раз два-тры чалавекі, якія [..]аюцца носьбітамі дыдактычных патра-

...ы я атрымала ад аднаго педаго-
...у якім ён абурыўся на мяне за
...ў маёй кнізе «З табой тава-
...ўроку Канстытуцыі настаўніца
...торыю пра негрыцёнка замест
...азваць аб Канстытуцыі.
...вы дапускаеце няпра-
...не жыцця? У школе,
...трыносіць
...пішуць
...нікаў
...тула
...е

гневалася. Паводле слоў аўтара, яна змянілася ў твары, пачала гучна крычаць, прабіраць дзяцей.

Няўжо тое, што чыж лётае па класу, павінна выклікаць такое абурэнне? Я думаю, што толькі з пункту гледжання гэтага «педагога» можна разглядаць такую падзею, як нейкае страшнае здарэнне ў класе.

Калі аўтар хацеў паказаць маладую настаўніцу ўсхваляванай, улюбёнай у сваю справу, калі ён хацеў выклікаць у чытача сімпатыі да яе, ён павінен быў з тактам паказаць яе паводзіны. Гамолка-ж сам малады чалавек, сам нядаўна быў у школе і павінен ведаць, што яшчэ не такія «падзеі» могуць быць у класе. Упэўнена, што дзеці не павераць, што гэта надзвычайнае здарэнне. Ніякага надзвычайнага здарэння тут няма.

Я лічу, што ў Гамолкі няма таго мастацкага такта, які можа падказаць пісьменніку, калі ён павінен абурацца і калі ён можа дабрадушна ўсміхнуцца.

Далей я хацела-б сказаць аб некаторых мастацкіх прыёмах, аб якіх іншы раз забываюць.

У нас ёсць рад пісьменнікаў, — да іх ліку належыць і тав. Гамолка, якія аддаюць перавагу дыялагічнай форме.

Вось я чытаю першыя 8 старонак аповесці «Добры дзень, школа!» З гэтых 8-мі старонак бачу, што галоўны герой Косця быў у Кахоўцы. Аб тым, што Косця быў у Кахоўцы, можна было расказаць на трох старонках, а Гамолка размазвае гэта на 8-мі старонках. Але таму, што на восем старонак цяжка расцягнуць адзін гэты факт, то ён прымяняе тут дыялог. Размовы гэтыя вельмі сумныя.

Я лічу, што аб гэтым трэба гаварыць вельмі сур'ёзна, тым больш, што ўся аповесць Гамолкі напісана ў такой дыялагічнай форме.

Мы ведаем, што дыялог — гэта моўная характарыстыка героя. Ёсць пісьменнікі, якія бліскуча валодаюць гэтай формай. У тав. Гамолкі, які празмерна злоўжывае дыялогам, паглядаецца адсутнасць такой моўнай характарыстыкі, і яго дыялог носіць інфармацыйны характар. Тое, што можна сказаць на поўстаронкі, у дыялогу расцягнута на некалькі старонак. Сваю аўтарскую мову Гамолка ўкладвае ў вусны героя, і героі вядуць размову на 5 — 6 старонках, каб паведаміць чытачу аб самых нязначных рэчах.

Я разумею, што нялёгка тав. Гамолку слухаць тое, аб чым я гавару, але я лічыла, што несумленна з маладым пісьменнікам, які напісаў другую аповесць, гаварыць намёкамі. Калі-б гэта было 15 год таму назад, калі нічога не было напісана аб школе, тады іншая справа, але-ж гэтая аповесць напісана пасля 15-ці год калектыўнай пісьменніцкай работы над гэтай тэмай.

Заканчваючы, я хачу звярнуцца да крытыка, які напісаў рэцэнзію на аповесць. Мне здаецца, што такія крытычныя артыкулы не прыносяць аўтару карысці. Яны толькі дэзарыентуюць яго. Нарэшце атрымаецца такая гісторыя, што Гамолка, рашыўшы, што так і трэба пісаць, напіша яшчэ 5—6 такіх-жа кніжак, бо яны вельмі лёгка пішуцца. Я лічу, што і мы вінаваты перад Гамолкам. Вінаваты ў тым, што не сказалі яму многа горкага тры гады таму назад, калі сустракаліся з ім.

Паэтычнае бачанне жыцця

З выступлення Б. ЧАЛАГА

Пісьменнікі Украіны пільна сочаць за поспехамі беларускай дзіцячай літаратуры. Яна багата таленавітымі людзьмі. Нам дарагі поспехі брацкай беларускай літаратуры.

Беларускі паэт Кастусь Кірэенка напісаў паэму «Алёнчына школа». Гэта добры твор для дзяцей, прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне. Паэма хвалюе чытача.

Як сапраўдны мастак, пісьменнік здолеў перадаць прыгажосць прыроды роднага краю.

У паэме многа цудоўных і яркіх мясцін. Іх нельга не запомніць. Добрая мова паэмы. Толькі павінен зазначыць, што пераклад, зроблены Благінінай, няўдалы. Многа мясцін празмерна расквечана, часта пераклад зніжае мастацкую вартасць паэмы. Неабходна аўтару больш патрабавальна ставіцца да перакладу свайго твора.

Зазначу і на недахопы паэмы. Празмерна агульны яе пачатак. Аўтар вельмі доўга гаворыць аб Алёнцы. Дзяўчынка сапраўды добрая, але, калі ёй аддаваць столькі ўвагі, як гэта робіць К. Кірэенка, то вобраз губляе сваю прывабнасць.

У паэме пададзена многа падзей, эпізодаў, але не паказана дзеянне дзяўчынкі. Ды і ўсёй паэме нехапае дзеяння. Алёнка паказана некалькі адзінокай. Вайна пачынаецца ў другой палавіне твора, і дзяўчынка па сутнасці справы ўвесь час адна.

Паэма называецца «Алёнчына школа». Трэба думаць, што гэта не толькі школа, якая была ў партызанскім атрадзе, але гэта, галоўным чынам, школа жыцця. Дзяўчынка многа перажыла за вайну. Гэта — вялікая школа, і яна аўтарам выпісана неканкрэтна. Аб усім гэтым неабходна было, як мне здаецца, расказаць больш, напісаць ярчэй, паэтычна ўсхвалявана.

Варта было цяплей расказаць і аб школе ў зямлянцы, аб партызанах, якія мужна ваявалі з ворагам і якія так пяшчотна клапаціліся аб дзецях. У паэме нічога не сказана аб настаўніцы. Аўтар не паказаў, як праходзіць урок у партызанскай школе. А гэта былі-б вельмі яркія мясціны твора, і яны адпавядалі-б назве паэмы.

Мне здаецца, што прысутнасць вобразаў дарослых у паэме абавязковая. Ім трэба аддаць увагі не менш, чым Алёнцы.

Спадзяюся, што аўтар будзе і далей працаваць над паэмай і ўлічыць усе нашы заўвагі.

* * *

Багдан Чалы прыняў удзел і ў абмеркаванні вершаў Анатоля Вялюгіна.

— Некаторыя творы Анатоля Вялюгіна, — гаворыць ён, — перакладзены на украінскую мову. Дзеці любяць яго вершы за тое, што ў іх многа яркіх паэтычных дэталей, яны лёгкія і простыя па форме і добра запамінаюцца. Вершам паэта ўласціва паэтычнасць.

Мне асабліва спадабаліся яго вершы «Уральскі танк і вёска Суніцы» і «Каспір». Вобраз Леніна намаляваны ярка. Аўтар здолеў мастацкі абагуліць думкі народа аб Уладзіміру Ільічу, перадаць глыбокую любоў народа да правадыра.

У зборніку «Галубы» ёсць верш «Раніца». На гэтую тэму напісана многа вершаў. Анатоль Вялюгін знайшоў свае мастацкія дэталі. Верш пачынаецца з паэтычнага апісання раніцы нашых шчаслівых дзяцей. Цудоўная канцоўка верша:

І гавораць касцы:
— Малайцы нашы дзеці!
Лагер разам прачнуўся з краінай усёй!

Адчуваеш глыбокую сувязь з народам: нашы дзеці жывуць актыўным жыццём сваёй любімай Радзімы.

Разам з тым у паэта трапляюцца агульныя, трафарэтна напісаныя вершы, у якіх не адчуваецца творчых пошукаў. Да ліку такіх твораў адносіцца верш «Зялёная крапасць». Мне хацелася-б, каб А. Вялюгін больш патрабавальна ставіўся да сваіх твораў і бясколерных, слабых вершаў не ўключаў у зборнік.

Аб мастацкай праўдзе і пераканальнасці

З выступлення М. БЕЛАХАВАЙ

Кніга А. Авечкіна «Саломка» мае ўдалую кампазіцыйную пабудову. Сюжэт яе стройны, зграбны. Падзеі ў творы заканамерна нарастаюць, заканамерна развіваюцца. Таму кніга чытаецца з цікавасцю.

Аднак цікавасць, з якой чытаецца «Саломка» юным чытачом, не павінна засланяць ад нас недахопаў гэтай кнігі. А недахопы ў ёй ёсць.

Аўтар недастаткова матывіруе падзеі. Учынкі яго герояў не заўсёды абгрунтаваны. У многіх месцах кнігі адсутнічае мастацкая праўда.

Пісьменнік, напрыклад, апавядае пра Саломку і Колю, якія знаходзяцца ў партызанскім лагеры. Ніхто не рыхтаваў іх да разведчыцкай дзейнасці, ніхто з імі не гутарыў, усю зіму яны нічога не рабілі. Раптам аднойчы выклікае іх камандзір і дае заданне: пайсці на чыгуначную станцыю і ўважліва паглядзець, колькі там немцаў, колькі эшалонаў праходзіць за суткі і што вязуць немцы. На гэта хлопчыкам далі тэрміну тры дні.

Вядома, цяжка паверыць у праўдзівасць гэтай сцэны. Хлопчыкам камандзір даў такое заданне, якое здольна выканаць толькі група вопытных разведчыкаў, а не два хлопчыкі, да таго-ж зусім не падрыхтаваныя і недасведчаныя ў разведчыцкай рабоце.

І вось Саломка і Коля адпраўляюцца на разведку. Яны ідуць лесам, палохаюць адзін другога, з імі адбываюцца розныя прыгоды. Потым, калі змеркла, хлопчыкі залезлі ў напоўразбураны хлеў. Ноччу яны ўбачылі, як прайшло пяць эшалонаў, з іх два з танкамі, а тры з салдатамі. Якжа яны маглі ўбачыць гэта ноччу?

Пра ўсё пісьменнік гаворыць скорагаворкай. Паказу разведкі няма.

Далей хлопчыкі пайшлі на станцыю і там убачылі эшалон, які прышоў і выгрузіўся. Яны сустракаюцца з нейкім Міцькам, які дае ім патрэбныя звесткі. Пасля гэтага вяртаюцца ў партызанскі лагер і дакладваюць пра вынікі разведкі. Тэрмінова склікаецца нарада. На падставе сабраных Колем і Саломкай дадзеных робіцца велізарнае камбініраванае выступленне атрада, і праз старонку пачынаецца наступленне, якое завяршаецца поўнай перамогай партызан.

Усяму гэтаму вельмі мала верыш.

Пісьменнік захапіўся прыгодамі. Ён забыў пра тое, што вобразы павінны быць мастацкі пераканальнымі, учынкі герояў — абгрунтаванымі.

Кніга Авечкіна не ўзбагачае чытача веданнем партызанскай барацьбы, у ёй не створаны праўдзівыя вобразы ні дзяцей, ні дарослых.

У творы важна не толькі тое, што напісаць, а і тое, як напісаць. Мастацкая праўда, пераканальнасць — неабходная якасць усякай добрай кнігі. Гэтай мастацкай праўды, гэтай пераканальнасці якраз і нестае аповесці А. Авечкіна «Саломка».

Канфлікт у творах выяўленчага мастацтва

П. ГЕРАСІМОВІЧ

У творчай працы беларускіх мастакоў таксама бытавала выкрытая партыяй шкодная тэорыя бесканфліктнасці. Мастакі часта адлюстроўвалі не барацьбу, а толькі вынік яе. Яны не актыўна ўтргаліся ў сутнасць з'яў, а ішлі следам за жыццём, занатоўваючы тое, што адбылося.

У апошнія гады мастакі багата часу трацілі на нязначныя жанравыя малюнкі. На мастацкіх выстаўках не было работ, у якіх смела і глыбока раскрывалася-б жыццё нашых людзей. Глядач вельмі рэдка знаходзіў у жывапісных творах адлюстраванне падзей, якія яго хвалююць.

У пасляваеннай творчасці мастакоў толькі нязначная колькасць твораў мае жыццёва важныя сітуацыі, дзе станоўчы вобраз савецкага чалавека пададзены ў складаных умовах жыцця і працы. Гэта творы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, людзям, якія прымалі ў ёй непасрэдны ўдзел. Сюжэтная аснова карціны «Немцаў вядуць» А. Шыбнёва — барацьба партызан з гітлераўскімі акупантамі. Цяжка крочаць гітлераўскія ваякі па снежнаму полю. Твары іх поўныя лютай злосці. Адчуваецца, што яшчэ не так даўно гэта былі моцныя ворагі, таму і мужнасць партызан уяўляецца больш гераічнай. Барацьба двух супрацьлеглых сіл у творы мае свой пачатак, сваю кульмінацыю і свой канец, таму карціна хвалюе і пераконвае гледача.

На барацьбе супрацьлеглых сіл пабудаваны сюжэт карціны В. Цвіркі «Непакораныя». Мастак паказвае духоўнае хараство патрыёта савецкай Радзімы.

Твораў на гэтыя тэмы напісана многа. Тыя з іх, якія знаходзяцца на высокай ступені мастацкага выканання, узбагацілі савецкае мастацтва і сталі шырока вядомымі.

Але калі ў жывапісу створана некалькі ўдалых, захапляючых сваім драматызмам карцін, то гэтага нельга сказаць пра партрэтны жанр, у якім мастакам не давялося ўзвысіцца над адлюстраваннем натуры. Кампазіцыйнага партрэта савецкага чалавека-героя з багатым светаадчуваннем беларускія мастакі яшчэ не напісалі.

І ад пейзажнага жывапісу мы павінны патрабаваць своеасаблівага сюжэтнага вырашэння. Пейзажы А. Саўрасава, Ф. Васільева, І. Левітана можна ставіць на ўзровень з сюжэтнымі творамі І. Рэпіна, В. Сурыкава, В. Перова, В. Васнецова.

Канфлікт у пейзажных творах мастакоў-рэалістаў адчуваецца ў глыбокім настроі, у пратэсце чалавека супраць несправядлівасці і прыгнёту.

Вось пейзаж І. Левітана «Уладзімірка». Сярод прастораў пралёг Уладзімірскі тракт — шлях, па якім гналі ў Сібір зняволеных. Шэрае неспакойнае неба і навакольная маўклівасць абуджаюць у нас пачуццё глыбокага пратэсту, якое адчувалі сотні і тысячы палітзняволеных, што ішлі па гэтаму шляху.

Рэалізм лепшых прадстаўнікоў пейзажнага жывапісу заключаецца ў тыповасці з'яў і настрояў, якія яны адлюстроўваюць, а таксама ў тыповасці сацыяльных супярэчнасцей і філасофскіх абагульненняў. Гэта ўзняло жанр пейзажнага жывапісу да высокага майстэрства.

Законна будзе шукаць і ў нашым пейзажным жывапісу зместу, з якога вырастаў-бы савецкі чалавек са сваім настроем і жаданнем будаваць і пераўтвараць, перамагаючы ўсе цяжкасці. Аднак пейзажная творчасць нашых мастакоў яшчэ вельмі слабая. Неглыбокі змест і невыразная вобразнасць натуры робяць пейзажныя творы падобнымі да эскізных занатовак.

Як паказала апошняя рэспубліканская выстаўка, у нас развіваецца галоўным чынам жанравы жывапіс, у пераважнай большасці на тэмы школьнага жыцця. У творах на гэтую тэму мы бачым, як дзеці збіраюцца ў школу, бачым іх на занятках. Творы В. Волкава «Вузаўцы» і А. Волкава «1-е верасня» ў гэтым жанры маюць безумоўную цікавасць. Астатнія-ж не ўзнімаюцца вышэй малазначных ілюстрацый быту савецкіх людзей. Мастакам нестае, перш за ўсё, сюжэтнай распрацоўкі твора, напружання дзеі, моцных вобразаў з багатым духоўным светам. Так, мастак А. Гугель напісаў досыць вялую і статычную карціну аб працы калгаснікаў на сенажаці. Следам за гэтым творам А. Гугель напісаў другі твор — «Трывожнае паведамленне», твор, цікавы сваім рашэннем. Савецкая сям'я ў час вайны жыве думкамі ўсяго народа. Усё тут, у невялікім пакоі, дапаўняе драматызм становішча: і лямпа на стале з папяровым абажурам, і палявая сумка сандружынніцы на крэсле. Пажылы рабочы пільна слухае паведамленне Совінформбюро і адзначае на карце прасоўванне войск Савецкай Арміі. Нарастанне дзеі выяўляецца ў моцным жаданні перамогі, якое адчуваюць героі карціны ды і глядач.

У айчынным рэалістычным жывапісу ёсць выдатныя ўзоры жанравых твораў, драматызм зместу якіх глыбока хвалюе.

У карціне Н. Багданава-Бельскага бедны вясковы хлапец, гледзячы праз дзверы школы, марыць пра навучанне. Але зараз такой мары быць не можа, бо навучанне ў нашай краіне стала абавязковым. Гэта ў сваю чаргу не азначае, што ў падобнай тэме не можа быць канфліктаў. Яны ёсць і іх можна знайсці ў жыцці савецкіх школьнікаў. Украінскі мастак С. Грыгор'еў на канфлікце, узятым з жыцця школы, пабудаваў хвалюючую карціну «Абмеркаванне двойкі». Ёсць і іншыя творы ў савецкім мастацтве, дзе адчуваецца вялікі ўплыў лепшых традыцый рэалістычнага мастацтва, якое брала ў аснову твора вострыя сітуацыі.

Героем савецкага мастацтва, як вучыць нас партыя, павінен быць чалавек, зместам жыцця якога з'яўляецца барацьба за комунізм. Весці барацьбу за новае, значыць адносіцца з нянавісцю да старога, якое перашкаджае руханню наперад. Не весці барацьбы з нашымі недахопамі, не заўважаць іх, значыць для мастака пісаць карціны без канфліктаў, а такія карціны нікога не ўсхвалююць, як не хвалююць шмат якія карціны, у якіх паказана, напрыклад, купанне коней, стрыжка авечак, любаванне наогул людзьмі, якія адпачываюць ці забаўляюцца.

Да такіх работ можна аднесці творы П. Раманоўскага «Сяброўкі», Р. Кудрэвіч «Вяртанне з поля», М. Беляніцкага «На конеферме», А. Заборава «На калгаснай ферме», Х. Ліўшыца «На мінскім тонкасуконным камбінаце» і рад іншых.

Ніякіх цяжкасцей людзі не пераадольваюць у гэтых карцінах. Героі тут усе добрыя, часцей за ўсё з усмешкамі на твары, жыццё іх бестурботнае, нішто іх не хвалюе. Гэтыя людзі будуюць новыя дамы на ўчарашніх папялішчах вельмі проста і лёгка.

Гледзячы на гэтых «герояў», думаеш: няўжо так лёгка людзі будуюць, ствараюць?

Сакрэт вялікай сілы ўздзеяння класічных твораў жывапісу тлумачыцца тым, што ў іх узята з жыцця самае істотнае і значнае і паказана ў драматычным развіцці.

Бесканфліктны жывапіс наогул не трывалы. Варта ўважліва разгледзець некаторыя творы беларускіх мастакоў, якія напісаны на тэмы мірнага жыцця і працы нашага народа, каб пераканацца ў тым, што ўся іх слабасць заключаецца ў недастаткова актыўным адлюстраванні тыповых з'яў жыцця.

Бесканфліктны жывапіс — вынік рэакцыйнага ўплыву буржуазнай ідэалогіі на мастацтва. Савецкія майстры мастацтва, авалодваючы класічнай спадчынай айчыннага рэалістычнага жывапісу, узброіўшыся сталінскім метадам сацыялістычнага рэалізма, вярнулі жыццё станкавай карціне, увасабляючы ў ёй мужных савецкіх людзей, іх жыццё, барацьбу за новы комуністычны свет.

«У сваіх творах, — гаворыць тав. Маленкоў, — нашы пісьменнікі і мастакі павінны бічаваць заганы, недахопы, хваравітыя з'явы, якія маюць пашырэнне ў грамадстве, раскрываць у станоўчых мастацкіх вобразах людзей новага тыпу ва ўсім хараство іх чалавечай годнасці і тым самым садзейнічаць выхаванню ў людзях нашага грамадства характараў, навыкаў, прывычак, свабодных ад язваў і заганаў, народжаных капіталізмам».

У Маскве адкрылася Усесаюзная мастацкая выстаўка 1952 года. У ёй удзельнічае больш 250 майстроў жывапісу, скульптуры, графікі з пяцідзесяці краёў, абласцей і аўтаномных рэспублік РСФСР. На выстаўцы дэманструецца звыш трохсот работ.

На здымку: у адной з залаў выстаўкі.

Фота А. Стужына. (Фотахроніка ТАСС).

Г. ШЧАРБАТАЎ

Высокародныя рысы совецкага чалавека

Совецкі чалавек, будаўнік комуністычнага грамадства. Як горда гучаць гэтыя словы, які глыбокі сэнс і значэнне ўкладваюць у іх усе народы свету! Совецкі чалавек паўстае перад усім светам, як нястомны абаронца міру і свабоды, дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі.

Совецкі чалавек увабраў у сябе ўсё самае цудоўнае, што дала совецкая ўлада: высокароднства замыслаў, страснае імкненне ўперад, грандыёзны размах планаў, цвёрдую ўпэўненасць у перамогу вялікай справы Леніна—Сталіна. Гэта неспакойны ў сваёй працы чалавек, поўны высокіх дум і светлых імкненняў, з прыгожай і багатай душой. Паказаць у літаратуры такога чалавека-творцу, раскрыць яго духоўны свет не раз заклікала наша партыя совецкіх пісьменнікаў.

Галоўнай тэмай кнігі «Глыбокая плынь» з'яўляецца тэма палымянага совецкага патрыятызма, непарушнай дружбы народаў совецкай краіны. Праз усе творы праходзіць думка аб магутнасці і непераможнасці совецкага народа, аб яго маральна-палітычным адзінстве і ценсай згуртаванасці вакол большэвіцкай партыі. Аўтар раскрывае маральную веліч і высокі інтэлект совецкіх людзей, выхаваных партыяй Леніна—Сталіна. Праз усе выпрабаванні лёсу яны праносяць сваю веру ў цудоўнае заўтра.

Праз вобразы простых совецкіх людзей Іван Шамякін умее паказаць усё хараство і прыгажосць душы совецкага народа, узлёт яго думак, высокароднасць яго імкненняў.

Вось вобраз маёра Раманенкі з аповесці «Помста». Гэта звычайны совецкі чалавек, настаўнік па прафесіі, якіх сотні тысяч у нашай краіне. У час Вялікай Айчыннай вайны ён стаў камандзірам танка і разам са сваімі сябрамі-танкістамі чатыры гады мужна адстойваў родную совецкую зямлю. Яго маці і жонка Галіна з малою дачкою засталіся на акупіраванай фашыстамі тэрыторыі Беларусі. Колькі дзён і начэй думаў Мікалай Раманенка аб сустрэчы са сваімі блізкімі, любымі, аб вызваленні роднай Беларусі з фашысцкага ярма! І вось гэты час настаў. Танкавая часць, у якой служыў былы настаўнік, з пераможнымі сцягамі ішла па беларускай зямлі. Раманенку прышлося выбіваць фашыстаў з роднага сяла Прыгары. З сумам і жальбаю глядзеў ён на сяло, дашчэнту разбурэнае і спаленае гітлераўскімі бандытамі. Хутка з лесу пачалі збірацца жыхары. Яны расказалі настаўніку аб страшэннай трагедыі яго сям'і. Фашысцкія вылюдкі расстралялі яго маці, дачку, мучылі і катавалі яго жонку Галіну, якая зараз знаходзіцца ў партызанах і хворая ляжыць у хаце лесніка.

І вось Раманенка перад паміраючай жонкай. Сэрца яго абліваецца крывёю, калі Галіна апавядае аб нечуваных злачынствах фашыстаў на беларускай зямлі. Яна просіць мужа:

«Любы мой, ты павінен дайсці да іх злодзейскага гнязда! Ты абавязкова павінен дайсці! Я цябе прашу, просіць твая дачка і твая маці. Ты павінен адпомсціць за ўсё... Ты павінен знайсці яго, абавязкова знайсці яго...».

І партызан Рыгор Пятровіч, які дзяжурыў каля хворай, падаў Мікалаю фотакартку таго гестапаўца, што лютаваў у іх раёне і застрэліў яго маці і дачку. На фота было прозвішча і хатні адрас фашыста.

Галіна паміраe. Раманенка дае клятву адпомсціць гітлераўскім забойцам за смерць сваіх родных, за смерць тысяч совецкіх людзей.

Аўтар пераносіць нас у Германію. Ідзе заключны этап вайны. Маёр Раманенка едзе ў горад Крывіц, адкуль быў родам той душагуб, які катаваў і забіваў мірнае насельніцтва беларускага сяла Прыгары.

Ён сапраўды знаходзіць дом гестапаўца. Яго сустрэлі спалоханыя бацька і маці ката. На адным з ложкаў ляжала маладая жанчына, а на другім — сядзелі двое дзяцей: дзяўчынка год сямі і хлапчук год чатырох.

«Хто гэта?» — рэзка спытаў Раманенка.

Праз перакладчыка ён высвятляе, што гэта жонка і дзеці гестапаўца, які здзекваўся над яго сям'ёй. Здавалася, вось ён прышоў, час расплаты. Аўтар падае вельмі праўдзівую карціну роздуму Раманенкі. «Што я павінен зрабіць? — думае Раманенка. — Помсціць дзецям, жанчыне? Не. Для мяне дзеці ёсць дзеці, хоць яны і дзеці ката. Я салдат. Я не магу забрудзіць свае рукі крывёю дзяцей».

Так аўтар ярка выяўляе адну з самых выдатных рыс совецкага чалавека — яго высокі гуманізм. Аповесць пераканальна паказвае, што салдаты вялікага Сталіна неслі на Захад не толькі вызваленне ад гітлераўскай тыраніі, але і сваю высокую соцыялістычную мараль, што яны атрымалі бліскучую перамогу над ворагам і ў маральна-палітычных адносінах. Пацярпела крах звярыная мараль чалавеканенавісніцтва, махровага нацыяналізма, чарнасоценных пагромаў і забойстваў, і перамагла мараль дружбы і роўнасці народаў, высокай годнасці чалавека, мараль сапраўднага гуманізма. Вось чаму верыш у заключныя словы аповесці «Помста», верыш у праўдзівасць пачуццяў Раманенкі. «... У глыбіні душы было лёгка і радасна. Якраз такое пачуццё было ў яго, калі ён у сорак першым годзе ў першым баі падбіў два нямецкія танкі. Ён зразумеў, што гэта радасць цяжкай перамогі — маральнай перамогі над сваім ворагам».

Гэтую-ж ідэю — ідэю маральна-палітычнай перавагі совецкіх людзей над фашысцкімі захопнікамі, брацкай дружбы народаў з яшчэ большай сілай раскрывае пісьменнік у сваім рамане «Глыбокая плынь». Совецкія людзі, намаляваныя ў рамане — гэта носьбіты самага перадавога ў свеце светапогляду. Выхаваныя партыяй большэвікоў, яны гатовы аддаць сваё жыццё за яе светлыя ідэалы. Іх сэрцы гараць полымем незгасальнай нянавісці да крывяжэрных разбойнікаў, якія носяцца з вар'яцкімі планамі заняволення ўсяго чалавецтва.

Героям «Глыбокай плыні» ўласцівы рысы, якімі валодае совецкі народ. Яны паказаны, як бязмежна адданыя сваёй соцыялістычнай Радзіме, як самаахвярныя барацьбіты за яе шчасце, духоўна багатыя ў сваім жыцці. Дружба народаў, брацкае адзінства, калектывізм для іх — гэта сутнасць жыцця. Так, калі Тацяна Маеўская выратоўвае ад забойцы-фашыста яўрэйскага хлопчыка і бярэ яго на выхаванне, яна лічыць гэта натуральнай справай. З якой пяшчотнасцю і любоўю яна адносіцца да гэтага чужога ёй дзіцяці!

Калі бацька Тацяны стары Карп Маеўскі і суседзі даведваюцца праўду аб дзіцяці, яны не асуджаюць дзяўчыну, а наадварот, усяляк падтрымліваюць яе і дапамагаюць хаваць дзіця ад вачэй забойцаў. Усюды — у вёсцы, у партызанскім атрадзе, у паходах і баях совецкія людзі зберагалі дзіця, нібы роднага сына, клапаталіва расцілі і выхоўвалі яго. У гэтым з усёй глыбінёй выявіўся пачуццё адзінай сям'і совецкіх людзей, іх непарушнай дружбы і згуртаванасці.

Многа патрыятычных думак выклікаюць у чытача эпізоды барацьбы партызан з карнай экспедыцыяй фон Адлера. Пісьменнік паказвае, якой канібальскай мараллю кіруецца гэты фашысцкі забойца ў генеральскім мундзіры. «Там, дзе пройдзем мы, павінна застацца пустыня і спыніцца ўсялякае жыццё», — гаварыў фон Адлер сваім афіцэрам і салдатам. Чытач ведае, што гэта не толькі яго, фон Адлера, намер, гэта звярыная мараль фашызма, які ставіць сваёй мэтай знішчэнне цэлых нацый.

І якой высокароднай з'яўляецца мэта герояў — Лясніцкага, Прыборнага, сям'і Маеўскіх, Буйскага — выратаваць ад вынішчэння кожнага совецкага чалавека, няхай нават цаною ўласнага жыцця.

У многіх творах аўтар паказвае, што ахвяраваць уласным жыццём у імя народа, у імя сваёй Радзімы стала адметнай рысай у характары совецкага чалавека. Шмат якія героі твораў пісьменніка рызыкуюць уласным жыццём у імя выратавання жыцця другіх. Але гэта не бяздумная рызыка. Яна прадыктавана тым глыбокім сэнсам чалавечага жыцця, які яно набыло ў нашай краіне ва ўмовах соцыялізма. Сваім жыццём рызыкуе, напрыклад, малады ўрач Сцяпан Чабрэц, які толькі што прыступіў да самастойнай працы (апавяданне «За жыццё»). Але чым выклікана неабходнасць гэтага? Патрэбнасцю дапамагчы людзям у іх горы, выратаваць хворае дзіця. І якім шчасцем напаўняецца сэрца маладога ўрача, калі дзіця пачынае ачуньваць. «Ён ішоў праз поле, а ў душы яго ўсё расла і расла вялікая хваля радасці. «Я ўратаваў жыццё чалавеку»,—ад гэтай думкі хацелася бегчы, смяяцца і спяваць. Гэта была ўжо не звычайная радасць прафесіянала, а нешта невымерна большае. Такое бывае тады, калі ў чалавека здзейсніцца яго галоўная жыццёвая мара».

Совецкі чалавек — гэта, перш за ўсё, чалавек калектыва. На ўласным вопыце, на вопыце будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне ён пераканаўся, што толькі калектыву пад сілу вялікія справы. Апавяданне «У снежнай пустыні» вельмі пераканаўча раскрывае гэтую тэму — тэму калектывізма і ўзаемавыручкі совецкіх людзей. Абставіны, у якіх дзейнічаюць героі гэтага твора, нагадваюць абставіны вядомага апавядання Дж. Лондана. Пасля аварыі самалёта два лётчыкі трапілі ў снежную пустыню Запаляр'я. Вядома, як далей развіваліся-б сітуацыі, калі-б гэта было апавяданне пра людзей буржуазнага свету. Адзін з лётчыкаў, больш моцны, забраў-бы ўвесь харч свайго таварыша і, па-здрадніцку кінуўшы яго аднаго на снезе, сам пачаў-бы прабівацца да людзей. І гэта было-б натуральна для капіталістычнага грамадства.

Совецкія лётчыкі, з'яднаныя адзінай мэтай, выхаваныя ў адзіным калектыве, не могуць пакінуць адзін другога ў бядзе. Камандзір самалёта Васіль робіць сабе і параненаму штурману Волкаву лыжы і некалькі дзён узапар, выбіваючыся з сіл, ідзе на ўсход, везучы за сабой раненага.

Вельмі пераканальна раскрываецца мараль двух светаў — свету соцыялізма і свету капіталізма ў такіх апавяданнях І. Шамякіна, як «Далёкая камандзіроўка» і «Хлопчык з-за акіяна». У першым з іх мы бачым, якой нязмернай высокароднасцю вылучаецца совецкі чалавек, што трапіў у кампанію да англійскага лорда Джуда Стона і дачкі ўласніка бакалейнай крамы ў Канадзе Гільды Нольбер. Пісьменнік яркімі мастацкімі дэталямі акрэслівае вобразы носьбітаў ідэалогіі капіталізма, якія гатовы праглынуць адзін другога, каб толькі ўратаваць сваё жыццё. У апавяданні «Хлопчык з-за акіяна» праўдзіва расказваецца аб расавай дыскрымінацыі, якая існуе ў Амерыцы, аб надзвычай цяжкім, бяспраўным становішчы неграў. Адначасова апавяданне падкрэслівае роўнасць і дружбу ўсіх народаў у нашай соцыялістычнай краіне.

Іван Шамякін — пісьменнік, які хутка расце. І некаторыя недахопы кнігі «Глыбокая плынь» ідуць ад яго творчай маладосці. Гэта перш за ўсё бачна на аповесці «Помста». У творы толькі вобраз маёра Раманенкі намаляваны даволі выразна. Астатнія вобразы бледныя, чытач мала чаго аб іх даведваецца. Аўтар не паказвае іх у развіцці.

Слабае апавяданне «Браты». Учынкі некаторых яго герояў недастаткова матывіраваны. Нічым не апраўдваюцца дэзертырскія паводзіны Міхайлы Міхеева. У аснову апавядання пакладзена рэдкі выпадак, не характэрны для нашай рэчаіснасці.

І. Шамякіну трэба больш настойліва працаваць над мовай сваіх твораў. Мова некаторых апавяданняў пісьменніка не вызначаецца свежасцю і багаццем. Сустракаюцца аднастайныя партрэтныя замалёўкі.

Пры ўсім гэтым, кніга «Глыбокая плынь» — каштоўны здабытак беларускай совецкай літаратуры. Яна дапамагае нашаму народу ў будаўніцтве комуністычнага грамадства.

Іван Шамякін. «Глыбокая плынь». Дзяржаўнае выдавецтва БССР. 1952 г.

Міхась Машара

(Да 50-годдзя з дня нараджэння)

Літаратурная грамадскасць рэспублікі адзначае 50-годдзе з дня нараджэння і чвэрць века літаратурнай дзейнасці Міхася Машары.

Міхась Машара прышоў у літаратуру ў 1927 годзе і праз год з поспехам выступіў са зборнікам вершаў «Малюнкі». Верш паэта былі арганічна звязаны з жыццём працоўнага народа, з яго крыўдамі і горам. Міхась Машара быў жывым сведкай суровага соцыяльнага і нацыянальнага прыгнёту польскімі імперыялістамі народаў заходніх беларускіх зямель.

Але, перш чым узняцца да ўсведамлення неабходнасці адзінства, зліцця з «духам бунту народнага», паэт прайшоў складаны шлях творчых пошукаў. Нізка вершаў «Падарожжа» праліває яркае святло на настроі паэта таго часу. Найбольш поўную і яркую характарыстыку даў паэту ў свой час Максім Танк у артыкуле «Страхі за гасцінцам». «Міхась Машара, — пісаў Танк, — тыповы паэт вёскі, вёскі, якая стаіць воддаль ад вялікіх гасцінцаў, па якіх ідуць людзі, скрыпяць калёсы абозаў з сялянскай бядой. Куды яны ідуць? А дзе мэта? Не відаць яе з прасёлачных дарог ды з меж... Толькі паэт чуе, што там, куды ідуць людзі, недзе ёсць шчасце, і яны яго здабудуць, і здабудуць для ўсіх. Кожная пяўдача тых людзей хвалюе паэта, кожны іх адважны крок, калі не парывае за сабой, усё-ж пакідае глыбокі след, улівае надзею ў поступ, у веру, у тыя далёкія вехі, якія гараць на народных шляхах».

Аднак і ў час заблуджэнняў і шуканняў Міхась Машара імкнуўся быць з народам. Ён перамагаў настроі пасіўнага чакання і ідылічнага сузірання змрочнай рэчаіснасці. І якім-бы няроўным ні быў творчы шлях, паэт заўсёды адчуваў сваю еднасць з народам:

Жыву ў бядзе, хаджу у латах,
Я — абарваны і не сыт,
Але не быў я рэнегатам,
І вольны духам — не наймít.

(«Шаркоўскім духоўнікам», 1935 г.)

Паэт здолеў падслухаць у народа яго думы і пачуцці і ўвасобіць іх у яркіх каларытных вобразах. Велічны вобраз новага свету — «светазорнага края Совецкага» — натхняе паэта, надае яго творам ідэйную вастрыню і яснасць.

М. Машара ўшчыльную падыходзіў да таго гістарычнага рубяжа — да славутага 17 верасня 1939 года, — за якім адкрываўся новы свет — жыццё ў адзінай Беларускай совецкай дзяржаве. Паэт верыў: «Прыдуць сюды людзі з упартаю воляй, разрэжуць балоты уздоўж і удаль, на тропах звярыных імпэтам вясёлым зазвоняць машыны і вострая сталь».

У совецкіх умовах талент паэта пасапраўднаму расквітнеў. Паступова перадольваючы перажыткі старых уплываў, узбагачаючы сваю творчасць дасягненнямі беларускай і рускай совецкай літаратуры, Міхась Машара прышоў да стварэння лепшых сваіх твораў.

У час Вялікай Айчыннай вайны паэт знаходзіўся ў радах Совецкай Арміі. Яго ваенная лірыка сабрана ў зборніку «Беларусі» (Масква, 1944 г.).

Апяваючы гераізм і бяспрыкладную адвагу сталінскіх воінаў, Міхась Машара стварыў нямала задушэўных лірычных вершаў. Ён услаўляе сваю родную Совецкую Беларусь, сумуе, што яе цудоўныя прасторы, дубровы і сенажаці, чароўная краса палёў часова трапілі пад бот гітлераўскіх забойцаў. Услаўляе людзей-герояў, якія мужна змагаюцца з гітлераўскімі рабаўласнікамі.

Мне не ведаць спакою ніколі:
Сум балючы да сэрца прырос.
Мне аб горы тваім у няволі
Вецер чорныя весткі прынёс.
Як ішла ты — нямелі бярозы.
На шляху вецер плакаў з табой,
І крывавыя горкія слёзы
Каты ботам змяшалі з зямлёй.

У гады мірнай стваральнай працы паэт паранейшаму — у перадавых радах барацьбітоў за вялікія ідэалы большэвіцкай партыі. Яго вершы, напісаныя пасля вайны, прысвечаны героіцы мірнай стваральнай працы нашых цудоўных людзей-творцаў, якія пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна пераможна ідуць да комунізма.

Гнеўным словам паэт паўстае супраць заакіянскіх і іншых падпальшчыкаў новай імперыялістычнай вайны, што зноў імкнуцца ўцягнуць народы свету ў крывавы вір, парушыць мірную стваральную працу совецкіх людзей.

Ідучы ў нагу з жыццём, М. Машара, несумненна, яшчэ напіша нямала твораў, у якіх уславіць веліч нашых дзён, нашу цудоўную совецкую бацькаўшчыну.

С. МАЙХРОВІЧ.

Новыя бібліятэкі

Расце сетка бібліятэк рэспублікі. Новыя бібліятэкі адкрываюцца ў сельскай мясцовасці, у гарадах і раённых цэнтрах. Нядаўна адкрыты тры новыя гарадскія бібліятэкі і 44 дзіцячыя.

Значна пашырылася сетка сельскіх бібліятэк. За дзевяць месяцаў гэтага года адкрыты 192 новыя сельскія бібліятэкі.

Няўдалая кніга пра Георгія Скарыну

★

Л. АБЕЦЭДАРСКІ,
кандыдат гістарычных навук.
А. СІДАРЭНКА,
кандыдат гістарычных навук.

★

Шматвяковая гісторыя беларускага народа — гэта гісторыя яго гераічнай барацьбы за сваё соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Яна напоўнена выдатнымі падзеямі і яскравымі фактамі, якія варты таго, каб быць асновай вялікіх гістарычных даследванняў і мастацкіх твораў.

Раман М. Садковіча «Георгі Скарына» з'яўляецца першым буйным празаічным творам на гістарычную тэму.

Перад М. Садковічам стаялі сур'ёзныя цяжкасці. Пра жыццё і дзейнасць Георгія Скарыны захаваліся вельмі скупыя звесткі. М. Садковічу, безумоўна, давялося правесці вялікую работу па збору, сістэматызацыі і абагульненню матэрыялу. Пісьменнік з любоўю адносіцца да свайго героя. Ён імкнецца паказаць яго як чалавека, патрыёта, вучонага, настойлівага ў дасягненні сваёй мэты, сціплага і працавітага чалавека, які аддае ўсе свае сілы і веды Радзіме. Аўтар спрабуе паказаць непрымірымую барацьбу народных мас Беларусі супраць панска-каталіцкай агрэсіі і тую дапамогу, якую яны атрымлівалі ад брацкага рускага народа.

У гэтым заключаецца станоўчае значэнне і вартасць кнігі «Георгі Скарына».

Аднак трэба прызнаць, што пісьменнік несур'ёзна падыйшоў да вырашэння надзвычай цяжкай творчай задачы і ўвогуле не справіўся з ёю.

У чым-жа прычына няўдачы кнігі М. Садковіча?

Жыццё і дзейнасць Георгія Скарыны прыпадае на канец XV і першую палову XVI стагоддзяў. Гэта быў час, калі над беларускім народам навісла пагроза не толькі поўнага соцыяльнага, але і нацыянальна-культурнага заняволення з боку польска-літоўскіх феадалаў і каталіцкай царквы.

Літоўскія магнаты, якія захапілі ў перыяд татара-мангольскага нашэсця на Русь заходнерускія княствы, ужо ў канцы XV стагоддзя пераканаліся ў поўнай немагчымасці ўтрымаць іх у сваіх руках уласнымі сіламі. Таму яны ішлі на ўмаўванне саюза з польскімі панамі і Ватыканам, спадзеючыся з іх дапамогай канчаткова замацавацца на беларускіх і ўкраінскіх землях. Гэтыя землі ў той час сталі арэнай жорсткай класавай і нацыянальна-рэлігійнай барацьбы.

Для таго, каб правільна ацаніць дзейнасць Георгія Скарыны, намаляваць яго сапраўдны вобраз, трэба даць усебаковую характарыстыку эпохі, месца і ўмоў яго жыцця і дзейнасці, — усяго таго, што рабіла рашаючы ўплыў на фармаванне яго светапогляду і вызначала яго ролю ў грамадскім жыцці Беларусі XVI стагоддзя.

М. Садковіч перш за ўсё павінен быў глыбока вывучыць гісторыю Беларусі гэтага перыяду і шырока паказаць соцыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча беларускіх зямель, раскрыць формы і змест барацьбы беларускага народа супраць панска-каталіцкай агрэсіі. Гэта М. Садковіч павінен быў зрабіць тым больш, што звестак пра Скарыну мала і пісьменнік непазбежна павінен звярнуцца да мастацкага домыслу. А ўсякі домысел, калі ён арганічна не звязаны з логікай гістарычных падзей, ператвараецца ў плод бойкай фантазіі, якая не толькі не дапамагае справе, а, наадварот, шкодзіць ёй.

На жаль, М. Садковіч, узяўшыся за вырашэнне складанай і вялікай задачы стварэння кнігі пра Георгія Скарыну, пайшоў па лініі найменшага супраціўлення. Ён вельмі мала аддаў увагі адлюстраванню бурных падзей першай паловы XVI стагоддзя ў Беларусі. Гэтым падзеям у той ці іншай меры прысвечана толькі незначная частка рамана. Але і гэтая частка напісана на нізкім ідэйна-мастацкім узроўні. Яна прадстаўляе сабой бездапаможную спробу даць аналіз складаных соцыяльных і нацыянальна-рэлігійных супярэчнасцей у Беларусі XV—XVI стагоддзяў.

У рамане да прымітывізма спрошчаны гэтыя супярэчнасці.

Вядома, што быў час у гісторыі, калі класавая барацьба ішла ў форме адной рэлігійнай ідэі супраць другой. І ў гісторыі беларускага народа быў час, калі класавая антыфеадальная барацьба народных мас мела рэлігійную, антыкаталіцкую афарбоўку. «Гэтая рэлігійная афарбоўка,— гаворыць Энгельс, — тлумачыцца не ўласцівасцю чалавечага сэрца і не рэлігійнай яго патрэбай, а ўсёй гісторыяй сярэдніх вякоў, якія ведалі толькі адну форму ідэалогіі — рэлігію і тэалогію».

Народныя масы Беларусі, выступаючы супраць панска-каталіцкай агрэсіі, змагаліся перш за ўсё супраць феадальна-прыгонніцкага прыгнёту. У той-жа час гэта была барацьба за захаванне сваёй народнасці, мовы, культуры, барацьба за далучэнне да рускай дзяржавы. Безумоўна, частка праваслаўных, свецкіх і царкоўных феадалаў, гарадская эксплаататарская вярхушка таксама выступалі супраць польска-літоўскай знаці і каталіцкай царквы. Але гэтыя выступленні мелі на мэце толькі ўмацаванне свайго манапольнага права эксплуатацыі народных мас Беларусі. Пры ўмове задаволення сваіх класавых інтарэсаў мясцовая феадальная знаць ахвотна ішла на кампраміс, утвараючы адзіны фронт з польска-літоўскімі магнатамі і Ватыканам.

Не разумеючы класавай сутнасці антыкаталіцкай барацьбы ў Беларусі, аўтар робіць грубейшую памылку і па сутнасці паўтарае нацыяналістычную тэорыйку «адзінай плыні». Барацьбу супраць панска-каталіцкай агрэсіі ён паказвае толькі як агульнанацыянальную барацьбу **ўсіх** беларусаў за сваю мову, веру і нацыянальную самабытнасць. М. Садковіч наіўна лічыць, што беларускія феадалы таксама адстойвалі правы і вольнасці народных мас. На старонцы 47 ён так і піша, што **баяры і дваране** Заходняй Русі «супраціўляліся, **адстойваючы правы і вольнасці беларускага народа**». На той-жа старонцы сцвярджаецца, нібыта носьбітамі феадальнага прыгнёту былі галоўным чынам польска-літоўскія феадалы і каталіцкая царква, нібыта толькі яны запрыгоньвалі «вольны народ Заходняй Русі». Трэба таксама адзначыць, што разважанні М. Садковіча пра былую **«волю**, пра былую славу беларускіх (?) дружын» (стар. 22) напамінаюць пісаніну беларускіх буржуазных нацыяналістаў пра тое, што нібыта ў перыяд Кіеўскай Русі існавала «вольная беларуская» дзяржава ў асобе Полацкага і іншых заходнерускіх княстваў.

У некаторых месцах рамана аўтар спрабуе намаляваць карціну цяжкага жыцця народных мас, клясавай барацьбы. Але гэтыя спробы абмежаваліся ўвядзеннем у раман эпізадычнага трафарэтнага вобраза сляпога лірніка Андрона, які стаў ахвярай самавольства баяроў, эпізода канфіскацыі ў рыбакоў чатырохмятровага (!) сома тым-жа баяродай і эпізода разгрому епіскапскага маёнтка каўстаўшымі сялянамі. Прычым, сяляне чамусьці паказваюцца п'яным натоўпам і названы «справядлівымі разбойнікамі» (стар. 60—63).

Георгі Скарына нарадзіўся каля 1490 года ў Полацку. Кінучае жыццё гэтага буйнейшага гандлёвага і рамесніцкага цэнтра яскрава адлюстроўвала становішча беларускіх зямель у канцы XV—пачатку XVI стагоддзяў. Без глыбокага паказу дзелавога, палітычнага і культурнага жыцця Полацка, дзе правёў сваё маленства і юнацтва Георгі Скарына, нельга зразумець, як фармаваліся яго погляды і характар.

Жыццё Полацка ў кнізе намаляванa павярхоўна і няправільна. Адсталым і прымітыўным паказаны гэты буйнейшы беларускі горад. Паводле думкі аўтара, гэта толькі вялікі абменны пункт, які пастаўляе на заходнееўрапейскія рынкі «лён, пяньку, смалу, воск і попел» (стар. 13). Рамяства тут наогул не існуе. Полацкія купцы атрымліваюць з заграніцы ўсе рамесніцкія вырабы, аж да сякер. М. Садковічу няўцям, што развіццё рамяства ў Беларусі ў XV—XVI стагоддзях дасягнула высокага ўзроўню, што полацкія рамеснікі, не забываючы традыцый прасланўленых заходнерускіх майстроў Іаана, Лазара Богшы, умелі вырабляць не толькі сякеры, але і самыя тонкія ювелірныя рэчы. Аўтар імкнецца пераканаць чытача ў заняпадзе беларускага рамяства наогул. Ён так малюе селішча, дзе здабывалі і плавілі жалезную руду: «Цяпер там, дзе некалі квітнела жыццё, ляглі густыя зараснікі. Ад усяго селішча засталіся дзве-тры хаты» (стар. 65). На самай справе, у XVI стагоддзі рамяство хутка развівалася, а здабыча і апрацоўка жалеза з мясцовай балотнай руды захавала сваё прамысловае значэнне ў Беларусі да канца XVIII стагоддзя.

Зусім ухіліўся М. Садковіч ад паказу складанага, кіпучага грамадскага жыцця горада Полацка. Полацкае насельніцтва ён малюе ў выглядзе аднароднай купецкай масы, якая звязана агульнымі інтарэсамі. Невыпадкова ў рамане знайшлося месца толькі для двух прадстаўнікоў нізоў гарадскога насельніцтва — юродзівага Анікея і п'яніцы Якубкі. Барацьбу гарадскога насельніцтва супраць панска-каталіцкай агрэсіі аўтар таксама паказвае ў выглядзе «адзінай плыні», не размяжоўваючы інтарэсаў гарадскіх багацеяў і гарадской беднаты. Калі верыць пісьменніку, дык гаражане «ўсім мірам паўставалі... і адстойвалі свае правы» (стар. 48).

Эксплаататарская вярхушка гарадскога насельніцтва выступае ў рамане ў якасці абаронцы інтарэсаў народных мас. Ідэалізуючы царкоўныя праваслаўныя брацтвы, дзе кіраўніцтва належала гарадскім багацеям, цесна звязаным з гарадскім самакіраўніцтвам, М. Садковіч паказвае гэтыя брацтвы галоўным чынам як брацтвы соцыяльныя, мэтай якіх была дапамога бедным і ўбогім. Словамі аднаго з персанажаў рамана аўтар так тлумачыць задачы брацтваў: «Мы бачым гора і слёзы многіх... Бачым і дапамогу за абавязак лічым... Дапамога наша многім патрэбна... слабым і ўбогім» (стар. 39—40).

Адсталай паказана і культура старажытнага Полацка, «беднымі і нікчэмнымі» (стар. 51) веды яго жыхароў. Аўтар лічыць, што акрамя гэтых «бедных і нікчэмных» ведаў Георгію Скарыне «навучыцца большаму тут, у Полацку, не было дзе і не было ў каго» (стар. 51).

М. Садковічу, відаць, невядома, што Полацк у XVI стагоддзі быў буйнейшым культурным цэнтрам, значэнне якога выходзіла далёка за межы Беларусі
цейшым кнігасховішчы Сафійс
былі сабраны ўнікальныя
толькі рускай, але і сусвет
І не выпадкова, што па
ўказанню Ватыкана гэта
было ў часе Лівонскай
ёзуітамі.

Пісьменнік аказаў
шыць важнейшую
задачы — яскра
намаляваць гі
зрабіла в
ванне с
Скар
З пе
шае
Еў

Микола Садкович. Георгий Скарина. Исторический роман. Издательство Академии наук БССР.

Да дэкады беларускай літаратуры і мастацтва

Дзяржаўны народны хор і яго рэпертуар

Другі раз Камітэт па справах мастацтва пры Савеце Міністраў БССР прагледзеў рэпертуар Дзяржаўнага народнага хора. На пасяджэнні Камітэта дырэктар хора Л. Ярмоліна і мастацкі кіраўнік Г. Цітовіч расказалі аб рабоце маладога калектыва над дэкадным рэпертуарам. Рэпертуар будзе значна пашыраны і ў першую чаргу за кошт сатырычных, жартоўных, лірычных, партызанскіх песень, частушак, новых танцаў і іншых песенна-танцавальных жанраў.

Выступіўшыя ў абмеркаванні тт. Леонцьеў, Кузняцоў, Рамановіч, Левашоў, Лютаровіч адзначылі, што хор паступова расце і становіцца цікавым творчым калектывам, які можа дастойна прадстаўляць на дэкадзе беларускае мастацтва. Тым не менш, кіраўніцтву хора трэба яшчэ многа папрацаваць, каб зрабіць дэкадную праграму ідэйна змястоўнай і мастацкі цікавай. Неабходна дабіцца яшчэ большай ансамблевасці асобных харавых груп хора і аркестра, умацаваць танцавальную групу, узняць харавую і танцавальную культуру выканання, рашыць пытанне аб мастацкім афармленні канцэртнай праграмы і г. д.

Кіраўніцтву хора прапанавана здаць мастацкаму савету дэкадную праграму ў канцы снежня.

АД РЭДАКЦЫІ:

Арганізацыя Дзяржаўнага народнага хора БССР — радасная з'ява. Амаль усе ўдзельнікі гэтага маладога калектыва выраслі ў народнай мастацкай самадзейнасці і прыйшлі ў хор з палымяным жаданнем удасканальваць сваё прафесійнае майстэрства.

Папярэднія прагляды праграмы хора даюць глыбокую ўпэўненасць, што гэта будзе вельмі яркі і самабытны мастацкі калектыў, які з часцю прадставіць беларускае мастацтва як у сваёй рэспубліцы, так і за яе межамі.

І таму, што гэты хор яшчэ вельмі малады і што за вельмі кароткі час, які застаўся да дэкады, ён павінен стаць поўнацэнным мастацкім калектывам — да яго неабходна паставіцца з асаблівай увагай.

Між тым, сёння яшчэ нельга сказаць не толькі аб асаблівай увазе, але і проста аб звычайнай сур'ёзнай дапамозе гэтаму таленавітаму калектыву.

Усім добра вядома, што поспех выступленняў хора будуць рашаць рэпертуар і багацце яго жанраў. Аднак гэтае важнейшае пытанне на першым і другім абмеркаваннях было закранута вельмі павярхоўна. Глыбокага аналізу паказанай праграмы па сутнасці не было. А праграма, ідэйна-мастацкія вартасці выконваемых твораў патрабуюць сур'ёзнай размовы. Гэтая размова павінна ў першую чаргу ісці пра змест рэпертуара.

На сённяшні дзень змест рэпертуара вельмі абмежаваны. У праграме няма ніводнай песні аб будоўлях комунізма і ў прыватнасці — аб асушцы Палескай нізіны, няма песень аб міры, аб роднай сталіцы Радзімы — Маскве, аб сённешніх днях Савецкай Беларусі, а такія песні павінны былі-б заняць першае месца ў рэпертуары. З іх, па сутнасці, трэба было і пачынаць падрыхтоўку дэкаднай праграмы.

Зусім відавочна і тое, што некаторыя песні і музычныя нумары, якія ўжо выконваюцца, не могуць застацца ў дэкаднай праграме па сваёй меладычнай беднасці і шэрасці («Добры дзень» муз. Трафімава, «Зубронак» Падкавырава, «Урачыстая прэлюдыя» і варыяцыі «Крыжэчка» ў выкананні аркестровай групы і другія).

У сваіх заўвагах аб рэпертуары хора газета «Літаратура і мастацтва» падкрэслівала жанравую аднастайнасць і беднасць сцэнічнай падачы праграмы. Было адзначана таксама, што хору ў гэтым сэнсе трэба больш смела пераймаць вопыт народных калектываў Савецкага Саюза.

Мастацкі кіраўнік хора Г. Цітовіч расказаў на пасяджэнні Камітэта аб жанравым узбагачэнні праграмы. Так, напрыклад, намечана ўключыць у праграму і інсцэніраваць песню «Як той Зосі давялося», «Беларускі карагод», жартоўныя песні «Пра дзяўчыну Мальвіну», «Падружкі», «Служыў я ў пана», шырока скарыстаць партызанскі фальклор, запісаць і развучыць народныя танцы і г. д. Усе гэтыя творы толькі ўключаны ў рэпертуар і над імі трэба яшчэ многа працаваць. Для іх падрыхтоўкі мастацкаму кіраўніку хора Г. Цітовічу патрэбна сур'ёзная дапамога. Для хора патрэбны рэжысёр, які мог-бы знайсці яркую і цікавую сцэнічную форму падачы ўсёй праграмы.

Але калі на пасяджэнні ўзнікла вельмі слушная прапанова, каб прымацаваць да хора рэжысёра канцэртнай праграмы, дык чамусьці кіраўніцтва Камітэта нічога пэўнага не сказала.

Камітэту па справах мастацтва і кіраўніцтву хора трэба мець на ўвазе, што на дэкаду ў Маскву трэба павезці **поўнацэнны** мастацкі калектыў, які быў-бы на ўзроўні лепшых народных калектываў Савецкага Саюза. Не можа быць апраўданнем тое, што народны хор яшчэ малады, толькі што арганізаваны і не меў часу папрацаваць як належыць над праграмай. Яшчэ ёсць час для дапрацоўкі дэкаднай праграмы.

Трэба, вядома, гаварыць і аб касцюмах удзельнікаў хора, аб музычных інструментах, знешнім афармленні канцэрта, але пры той умове, калі ўжо ёсць неабходная аснова праграмы.

Да гэтага-ж часу больш гаварылася аб другарадным, а не аб галоўным — рэпертуары, яго змесце, жанрах і іх сцэнічным вырашэнні.

Скульптар С. Селіханаў закончыў работу над скульптурай М. Е. Салтыкова-Шчэдрына для дэкаднай выстаўкі беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве.

Фота І. Салавейчыка.

Разьба па дрэву

Сярод шматлікіх экспанатаў Магілёўскай абласной выстаўкі выяўленчага і прыкладнога мастацтва вялікую цікавасць прадстаўляюць работы рэзчыкаў па дрэву. Таленавітыя рэзчыкі-мастакі любоўна выканалі барэльефы В. І. Леніна, І. В. Сталіна, А. М. Горкага. Калгаснік Б. Хрушчоў (Бялыніцкі раён) прыслаў барэльефы А. Радзішчэва і Я. Райніса, юны мастак Коля Палякоў (г. Чаусы) — дасканала выкананую скульптуру «Чапаеў у баю», выхаванцы дзіцячага дома № 6 (г. Магілёў) М. Вярхоўцаў і С. Барысёнак — барэльеф «Маладагвардзейцы», Коля Маторaў — партрэт Якуба Коласа.

З Чаускага дзіцячага дома прыслалі бюст пераўтваральніка прыроды Мічурына і вазу «Багацце» — сімвал няспыннага росту матэрыяльнага дабрабыту працоўных. Выдатна выкананы мазаічныя работы калектыва выхаванцаў дзіцячага дома № 6 гор. Магілёва (25 юных мастакоў): круглы стол з 64.352 кавалачкаў розных парод дрэва і шахматны столік з 12.730 кавалачкаў дрэва.

В. АРЦЕМ'ЕЎ.

Кніга пра народнага паэта

Выдавецтва Акадэміі навук БССР выпусціла ў свет падрыхтаваную музеем Янкі Купалы кнігу «Янка Купала». Кніга ўяўляе сабой зборнік дакументаў, артыкулаў, успамінаў аб жыццёвым і творчым шляху выдатнага песняра беларускага народа.

У зборніку змешчаны аўтабіяграфічныя матэрыялы паэта, крытычныя артыкулы і выказванні пра яго Якуба Коласа, А. Луначарскага, М. Ісакоўскага, М. Лынькова, К. Чорнага, Т. Масэнкі і другіх.

Кніга складзена Ул. Луцэвіч і В. Тарасавым.

Мастак жыццёвай праўды

Да стагоддзя з дня смерці П. А. Федотава

26 лістапада споўнілася сто год з дня смерці выдатнага рускага мастака Паўла Андрэевіча Федотава. З'яўляючыся адным з пачынальнікаў рэалістычнага напрамку ў рускім мастацтве, Федотаў належаў да тых вялікіх рускіх жывапісцаў, чыё мастацтва стала неад'емнай часткай нашай культуры.

Нацыянальныя асаблівасці рускага рэалістычнага мастацтва, якія так ярка праявіліся ў яго творчасці, пераклікаюцца з рускай рэалістычнай літаратурай, якая адлюстроўвала думкі і спадзяванні народа.

Творы мастака, у якіх глыбока адлюстраваны жорсткія норавы, карыслівасць і бяздушша дваранска-буржуазнага грамадства, вызначылі так званы «федотаўскі» перыяд у гісторыі рускага мастацтва, характэрны надзённасцю тэмы, трапнай характарыстыкай тыпаў, праўдзівым адлюстраваннем з'яў рускага жыцця.

Біяграфія Федотава кароткая. Нарадзіўся ён у 1815 годзе ў Маскве ў сям'і беднага адстаўнога афіцэра. Сем год правёў у жорсткіх умовах казармы кадэцкага корпуса, пасля заканчэння якога быў пераведзены ў пецербургскі Фінляндскі полк, у якім праслужыў да 1844 года.

Здольнасці да малявання ў Федотава праявіліся рана. У палку ён хутка атрымаў шырокую вядомасць як мастак-аматар. Побач з вайсковай службай Федотаў займаўся мастацтвам, наведваў вячэрнія класы Акадэміі мастацтва.

Толькі на 29-м годзе жыцця Федотаў поўнасцю прысвячае сябе мастацтву. Блізка прымкнуўшы да дэмакратычнага руху, у сваіх карцінах ён узнімае сацыяльныя пытанні, якія глыбока хвалявалі ў той час рускую грамадскасць.

У 1844 годзе ў Расіі наглядаецца агульны рэвалюцыйны ўздым, узмацняюцца сялянскія хваляванні. Разгортваюць сваю дзейнасць Герцэн і Огараў. Гэта не магло не зрабіць уплыву і на рускае мастацтва.

Мастак-дэмакрат Федотаў не мог бесклапотна пісаць нацюрморты, інтэр'еры або кісейных паненак з сабачкамі ў той час, калі Гогаль ствараў свае «Мёртвыя душы». Сваёй творчасцю ён змагаўся з прыгонніцкім ладам, прапагандуючы ідэі дэмакратызма і нацыянальнай незалежнасці. Ім напісаны невялікія па сваіх памерах карціны на жанравыя тэмы, якія сталі этапнымі для рускага жывапісу.

У 1846 годзе з'явілася карціна «Раніца чыноўніка», або «Свежы кавалер». У гэтым палатне высмейваецца чыноўнік, які выхваляецца сваім ордэнам. Поўная пыхлівасці фігура чыноўніка камічна падкрэсліваецца яго адзеннем. Разбітыя талеркі і бутэлькі на падлозе, гітара з абарванымі струнамі сведчаць аб тым, што тут адбывалася віншаванне «кавалера», а хвасты ад селядцоў — аб тым, што яно было вельмі мізэрным. Міміка, жэст, поза «свежага кавалера» характарызуюць вобраз пустога фанабэрыстага мікалаеўскага чыноўніка.

Выдатнае дасягненне мастака — карціна «Сватаўство маёра», за якую Акадэмія мастацтва прысудзіла яму годнасць акадэміка. Здзіўляе майстэрская пабудова кампазіцыі карціны, па-гогалеўску тыповыя фігуры з красамоўнымі рухамі і жэстамі.

Усе фігуры выхаплены мастаком з жыцця. У іх падкрэслены мара купецкай сям'і паградніцца з дваранінам-афіцэрам, самазадаволенасць маёра, які ўпэўнены, што багатая жаніцьба выратуе яго ад збяднення.

У пачатку 50-х гадоў Федотаў перажывае цяжкую душэўную драму. Разгром рэвалюцыйнага руху, жорсткая рэакцыя, якая панавала ў краіне пасля 1848 года, рэпрэсіі супраць лепшых рускіх людзей — усё гэта вельмі ўразіла мастака. Да таго-ж былі забаронены яго літаграфіі, канфіскаваны альманах, у якім ён удзельнічаў, спыніліся заказы.

Творчы шлях мастака абарваўся ў росквіце сіл.

П. А. Федотаў унёс вялікі ўклад у скарбніцу рускага і сусветнага мастацтва. В. В. Стасаў пісаў аб ім: «Федотаў памёр, пусціўшы на свет толькі маленькую крупінку з таго багацця, якім надзелена была яго натура. Але гэтая крупінка была чыстае золата і прынесла потым вялікія плады».

С. ПАЛЕЕС.

Чаму не працуе мастацкі совет тэатра імя Я. Купалы?

Вялікую ролю ў жыцці тэатра адыгрывае мастацкі совет. Няма ніводнага творчага пытання, якое не абмяркоўвалася-б сумесна з ім. Мастацкі совет з'яўляецца дарадчым органам пры дырэктару. Паколькі ў совет уваходзяць старэйшыя высокакваліфікаваныя работнікі тэатра, іх калектыўная думка з'яўляецца надзвычай важнай, а часта бывае і рашаючай. Напрыклад, размяркоўваюцца ролі па новай п'есе, якая прынята ў рэпертуар. Права размеркавання належыць рэжысёру. Зацвярджае размеркаванне дырэктар тэатра. Здавалася-б, навошта тут яшчэ мастацкі совет? Рэжысёр-жа адказвае за пастаноўку. І аднак там, дзе мастацкі совет працуе добра, дырэктар і рэжысёр больш правільна вырашаюць усе творчыя пытанні, менш робяць памылак.

Часта члены мастацкага совета папраўляюць рэжысёра, указваюць яму на памылковасць трактоўкі той ці іншай ролі. Рэжысёр згаджаецца з мастацкім советам і тут-жа замяняе аднаго актора другім.

Там, дзе добра працуе мастацкі совет, менш памыляецца дырэкцыя, у калектыве ўстанаўліваецца нармальная рабочая абстаноўка. Жаданні калектыва знаходзяць сваё ажыццяўленне праз старшых таварышаў у мастацкім совеце.

Каля года я працую ў тэатры імя Янкі Купалы. Ёсць у ім партыйная арганізацыя, мясцком і комсамольская група, а органа, які дапамагае дырэкцыі ў вырашэнні творчых пытанняў — мастацкага совета,—па сутнасці няма. Праўда, на паперы ён ёсць, а на справе нічым не займаецца. Гэта тлумачыцца, з аднаго боку, тым, што ранейшыя фармалісты-рэжысёры не лічыліся з яго думкай і адбілі ахвоту абмяркоўваць важнейшыя творчыя пытанні. Але гэтай ахвоты не заўважаецца і зараз. Дырэкцыя тэатра не зацікаўлена ў рабоце мастацкага совета і чамусьці лічыць непатрэбным прыслухоўвацца да яго думкі. Дырэкцыі больш да спадобы вырашаць усё ціха, па-келейнаму: дамовіўся з рэжысёрам, вывесіў загад, і ўсё. Трэба сказаць, што і некаторыя члены мастацкага совета абыякава ставяцца да сваіх абавязкаў і скептычна гавораць: «Тэатр працуе дрэнна, тут нічога і мастацкі совет не дапаможа».

А між тым, тэатр працаваў-бы значна лепш, каб мастацкі совет актыўна ўдзельнічаў у творчым жыцці калектыва. Не абмяркоўваліся, напрыклад, эскізы дэкарацый «Аленькай кветачкі». Ёсць нараканне, што эскізы занадта «оперныя», што яны не адпавядаюць духу казкі Аксакава.

Не ўдзельнічаў мастацкі совет у абмеркаванні пастановачнага плана спектакля «Кастрычнік», які некалькі разоў дапрацоўваўся. Не абмеркаваны спектакль «Шчасце паэта». Можна было-б і яшчэ прывесці прыклады.

У тэатры заўсёды ёсць шмат творчых пытанняў, якія патрабуюць вырашэння на мастацкім совеце. А цяпер, у сувязі з надыходзячай дэкадай беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве, гэтых пытанняў узнікае ў некалькі разоў больш, чым звычайна.

Неабходна, каб мастацкі совет у тэатры імя Янкі Купалы заняў такое месца, якое ён павінен займаць па праву.

П. МАЛЧАНАЎ,
народны артыст СССР, лаўрэат Сталінскай прэміі.

„Машанька“

Пачуццём радасці жыцця, бязмежнай любві да сацыялістычнай Радзімы, да савецкіх людзей, якія будуюць комунізм, прасякнута ўся творчасць таленавітага драматурга А. Афінагенава. Стапоўчыя героі яго п'ес — гэта героі нашага часу. Яны блізкія і дарагія нам, сённяшнім гледачам і чытачам. Яны сагрэты жывым, гарачым пачуццём савецкага мастака. У героях драматурга — простых савецкіх людзях — мы бачым аблічча нашага народа.

Поўны прываблівасці і ўнутранага хараства вобраз Машанькі Акаёмавай з самай папулярнай п'есы А. Афінагенава «Машанька».

За лёсам жыццерадаснай, чыстай сэрцам Машанькі і яе школьных таварышаў уважліва сочыць глядач. Ён шчыра радуецца іх поспехам, горка перажывае іх няўдачы.

«... Амаль тры чвэрці века я хаджу па зямлі, — гаворыць у заключнай сцэне спектакля прафесар Акаёмаў. — Пяцьдзесят гадоў я вывучаў пергаменты і скруткі... А цяпер іншая навука хвалюе і вабіць мяне... Навука аб бацьках... Свае пергаменты я вывучаў гадамі — гэта было маёй прафесіяй... Але ніколі да сённяшняга дня не задумваўся я над тым, каб быць бацькам або маці — гэта таксама прафесія... І гэтая другая прафесія ёсць майстэрства выхавання новага пакалення грамадзян».

Аб фарміраванні характару новага грамадзяніна нашай краіны, аб неабходнасці правільнага яго выхавання і расказвае п'еса «Машанька». Асабліва хвалюе яна савецкіх людзей сёння, калі перад нашым грамадствам, перад бацькамі і школай стаіць задача: выхаваць нашу моладзь бадзёрай, жыццерадаснай, адданай Радзіме, якая верыць у перамогу нашай справы, не баіцца перашкод, здольна пераадольваць любыя цяжкасці.

Тэма выхавання падрастаючага пакалення гучыць як асноўная, пераважная тэма ва ўзноўленай пастаноўцы «Машанькі», ажыццёўленай тэатрам імя Янкі Купалы (рэжысёр К. Саннікаў). Гэты спектакль паказаў, што сакрэт даўгалецця твора — ў яго праўдзівых вобразах, у яго глыбокай і хвалюючай ідэі.

Крыніцай маладосці спектакля з'яўляецца таксама свежае, пранікнёнае выкананне артысткай Т. Аляксеевай ролі Машанькі. Думкі і перажыванні Машанькі глыбока раскрыты артысткай, шчырая і праўдзівая ігра якой па-сапраўднаму хвалюе.

Як голас жыцця, што б'е крыніцай за вокнамі акаёмаўскага дома, уваходзіць у абстаўлены кнігамі кабінет прафесара Акаёмава пятнаццацігадовая дзяўчынка Маша. Вочы яе поўныя дзіцячай дапытлівасці: як сустрэне яе дзядуля? Але дзядуля (артыст С. Бірыла) вельмі заняты, ён нават не паглядзеў на дзяўчынку. Дапытлівасць на твары Машанькі-Аляксеевай змяняецца шчырым здзіўленнем; рухі яе сталі раптам нязграбнымі. Дзяўчынка разгубілася і не ведае, што ёй рабіць далей. Вочы яе заблішчэлі, сэрца сціснулася ад роспачы і крыўды: яна чакала радаснай сустрэчы з невядомым, але родным дзядулем, а сустрэла халоднае раўнадушша. Не маючы сілы стрымаць слёзы і плач, Машанька-Аляксеева імкліва выходзіць з пакоя...

Праходзіць некаторы час, і глядач бачыць Машаньку такой, якой яна была да прыходу ў дом Акаёмава: поўнай шчасцем жыцця, сардэчнай, шчырай, праўдзівай. Яе чулая, пяшчотная душа, яе дзіцячая непасрэднасць і прыхільнасць да дзядулі, вясёлы, па-дзіцячаму шумлівы нораў паступова змякчаюць, здавалася, чорствую душу старога вучонага: ён пачынае звыкацца з шумам і весялосцю ў доме. Радасны, звонкі смех Машы гучыць для яго ўжо чароўнай музыкай. Акаёмаў непрыкметна для сябе становіцца больш бадзёрым. Ён нібы памаладзеў, па-новаму глянуў на жыццё. З прыходам у дом Машы праца старога стала больш радаснай, — яна набыла для яго новы сэнс. І калі з'яўляецца маці Машы, каб забраць яе зноў да сябе, у душы Акаёмава-Бірылы наспявае поўная вялікага трагізма драма. Твар яго, як раней, становіцца суровым, вочы — халоднымі, нават безжыццёвымі. Ён зразумеў, што без Машы і тых, хто прыйшоў у дом разам з ёю, ён жыць не зможа.

Раней «някранутая, нераскрытая» навука аб выхаванні дзяцей становіцца для Акаёмава цяпер другой прафесіяй. Разам з прафесіяй вучонага яна дае яму сапраўдную радасць і шчасце ў жыцці.

Складаны, багаты думкамі і пачуццямі вобраз Акаёмава добра раскрыты ў спектаклі артыстам С. Бірылам, які іграе гэтую ролю на працягу адзінаццаці год. Актор здолеў не толькі захаваць усе раней знойдзеныя рысы ролі, але і надаць вобразу новае гучанне. Гэтае новае выражана ім у вялікай любві старога вучонага да жыцця, у імкненні сваю шматгадовую працу, свае сілы аддаць на карысць новага савецкага пакалення, якое будуе светлую будучыню — комунізм.

Тая цікавасць, якую праяўляе глядач да спектакля «Машанька», патрабуе, каб і ўсе астатнія артысты выконвалі свае ролі на высокім мастацкім узроўні.

А. БЯСТУЖАЎ.

Няўдалая кніга пра Георгія Скарыну

Заканчэнне.

Аўтар вядзе Георгія Скарыну ў Заходнюю Еўропу чалавекам, які зусім не ведае свайго народа. «Георгі ніколі не бываў далёка за межамі Полацка,—чытаем у рамане, — і меў толькі цьмянае ўяўленне пра жыхароў, якія схаваны лясной гушчай сёл і глухіх хутароў. Сяляне, з якімі ён сустракаўся і раней на полацкіх кірмашах, не выклікалі ў ім цікавасці» (стар. 54). Праўда, М. Садковіч запэўнівае чытача, што сяляне, якіх Георгі Скарына зусім не ведаў, «былі для яго больш блізкімі і больш роднымі, чым спрытныя каталіцкія манахі і ўладарныя епіскапы, якія шнырылі па ўсяму краю і якія спустошалі беларускія сёлы» (стар. 64). З гэтага сцверджання— хоча таго аўтар рамана ці не — вынікае, што каталіцкія манахі і епіскапы былі ў пэўнай меры блізкімі і роднымі Георгію Скарыне, што з'яўляецца паклёпам на славутага сына беларускага народа.

Георгі Скарына, паводле М. Садковіча, [illegible] радзіму, нічога не ведаў пра [illegible] беларускага сялянства супраць [illegible]альнікаў. Наіўнымі і шыро[illegible]чыма паглядае ён разгром [illegible]кага маёнтка. І тут аўтар [illegible] Георгія Скарыну вы[illegible]ага манаха ад справяд[illegible]

[illegible] Георгія Скарыну ў [illegible]кі чалавекам, які [illegible]оў яго жыцця і [illegible] беднымі, нік[illegible]ца Мацвея, [illegible]азвіцца [illegible]віч[illegible] таго, каб паказаць, «якой вялікай была адлегласць, што аддзяляла сціплую прамудрасць айца Мацвея ад высокай універсітэцкай навукі» (стар. 97) каталіцкіх папоў. Гэтым пісьменнік імкнецца даказаць, што там, дзе не было універсітэтаў, не магло быць і гутаркі пра якую-небудзь навуку і культуру. Вядома, што ў Беларусі, як і ў Маскоўскай Русі, універсітэтаў у XVI стагоддзі не было. Але гэта зусім не азначае, што навука і культура Русі гэтага перыяду стаяла ніжэй за навуку і культуру краін Заходняй Еўропы, дзе каталіцкія папы душылі ўсякі праблеск жывой творчай думкі. Гэтую агульнавядомую ісціну павінен быў не забываць аўтар рамана.

З ад'ездам Георгія Скарыны ў Кракаў пісьменнік, па сутнасці, абрывае ўсе яго сувязі з радзімай.

Што-ж прадстаўляе сабой астатняя, большая частка рамана, у якой апавядаецца аб працяглым жыцці Георгія Скарыны ў Заходняй Еўропе?

Яна прадстаўляе сабой бойка напісаную прыгодніцкую аповесць з заблытанымі інтрыгамі і іншымі аксесуарамі падобнага роду твораў: забойствамі, чараўніцамі, шпіёнамі, серэнадамі і г. д. У гэтай частцы рамана празмерная фантазія аўтара далёка адводзіць чытача ад падзей і фактаў, якія адносяцца да Беларусі, беларускага народа і самога Георгія Скарыны.

Праўда, М. Садковіч паспрабаваў аднавіць парваныя ім сувязі Георгія Скарыны з радзімай. Ён зноў прывёў яго ў Беларусь у гады вайны Маскоўскай дзяржавы з Літоўскім княствам за заходнерускія землі. У гэтай вайне насельніцтва Беларусі ўсяляк падтрымлівала рускія войскі.

Непрыветна і абыякава, па думку М. Садковіча, сустрэла спакутаваная радзіма свайго сына. Георгі Скарына аказаўся непатрэбным нават роднаму Полацку. Праслаўлены «ў лекарскіх навуках доктар» і цяпер не здольны быў разабрацца ў падзеях, што адбываліся, і знайсці сваё месца ў барацьбе свайго народа супраць прыгнятальнікаў. Ён сумуе, аддаецца салодкім успамінам пра жыццё ў Заходняй Еўропе, імкнецца туды зноў. І зноў аўтар спяшаецца павесці свайго героя за межы Беларусі. Там яму лягчэй вадзіць Скарыну па блытаных закутках сюжэта свайго апавядання.

У свой час В. В. Стасаў падкрэсліваў выключна вялікую ролю Георгія Скарыны ў збліжэнні беларускай культуры з культурай вялікага рускага народа. У рамане М. Садковіча не знайшлося месца для паказу і гэтага важнейшага боку дзейнасці гарачага патрыёта рускай зямлі, якім быў Георгі Скарына.

У вялікім рамане М. Садковіча, прысвечаным Георгію Скарыне, сапраўдны, праўдзівы вобраз Георгія Скарыны не створаны. Вобраз гэты атрымаўся расплывістым, не ясным, і ўявіць Скарыну, яго ролю і значэнне ў гісторыі Беларусі па раману М. Садковіча немагчыма. Жадаў гэтага аўтар ці не жадаў, але свайго героя ён намаляваў вандроўным вучоным-касмапалітам, які не меў арганічнай сувязі з радзімай. Гэта адбылося таму, што жыццё і дзейнасць Г. Скарыны паказаны па-за жывой гісторыяй беларускага народа, верным сынам якога ён быў.

Невядома, дзе правёў Скарына многія гады свайго свядомага жыцця. Пра гады жыцця Георгія Скарыны ў Заходняй Еўропе (Кракаў, Падуя, Прага, Кенігсберг) ёсць некаторыя дадзеныя. Але амаль няма дадзеных пра яго жыццё ў Беларусі.

Вядома, што іезуітамі праводзіліся масавыя перыядычныя чысткі кнігасховішчаў і архіваў у Беларусі. Імі была па-варварску знішчана велізарная колькасць кніг і дакументаў. Акрамя таго, тэрыторыя Беларусі не раз на працягу стагоддзяў з'яўлялася арэнай паўстанняў і спустошальных войн, у часе якіх таксама загінула вялікая колькасць культурных каштоўнасцей. Зусім верагодна, што дадзеныя пра жыццё Георгія Скарыны ў Беларусі безвартотна загінулі, як загінулі і многія яго выданні. Мы маем поўную падставу меркаваць, што гады жыцця, праведзеныя Скарынай невядома дзе, ён правёў у Беларусі. У пісьменніка М. Садковіча меліся неабмежаваныя магчымасці для выкарыстання мастацкага домыслу, абгрунтаванага логікай гістарычных падзей. На жаль, гэтыя магчымасці М. Садковіч не выкарыстаў.

Другія персанажы рамана таксама напісаны невыразна (Капернік, Глагоўскі, Маргарыта, Якуб Бабіч). Выключэннем з'яўляюцца вобразы шляхціца Нікалая Крывуша і агента Ватыкана Іагана фон Рэйхенберга. Трэба заўважыць, што вобразу Іагана фон Рэйхенберга аўтар адводзіць празмерна шмат увагі, і гэты персанаж часам засланяе галоўнага героя рамана. Выпісаны рэльефна, з сімпатыяй, вобраз шляхціца-забулдыгі Нікалая Крывуша лішні ў рамане. Створаны для таго, каб сімвалізаваць дружбу польскага і беларускага народаў, ён не можа выканаць гэтай ролі, таму што не тыповы для польскага народа.

Выдавецтва Акадэміі навук БССР дапусціла памылку, выпусціўшы сырую, заганную кнігу М. Садковіча. У пасляслоўі выдавецтва ўказана, што раман М. Садковіча выходзіць другім выданнем — выпраўленым, перагледжаным і дапоўненым. Між тым, першая частка рамана, якая, як вядома, была напісана ў суаўтарстве і ў свой час справядліва крытыкавалася, уключана ў гэтае выданне без істотнай дапрацоўкі.

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЁЎ, Аляксей КУЛАКОЎСКІ, Пімен ПАНЧАНКА.

[illegible] Сталіна, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

Надрукавана ў друкарні «Во славу Родины» з набора друкарні «Чырвоны друкар».